

ІНТЭРНЭТ І ГАДЖЭТЫ — ТОЛЬКІ ІНСТРУМЕНТЫ...

ЧЫРВОНКА

«КАРАТЭ — ГЭТА ШЛЯХ ДАЎЖЫНЁЙ У ЖЫЦЦЁ»

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 СНЕЖНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 231 (29098)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ПАРЭЧЫНА, кандыдат палітычных навук, дацэнт кафедры паліталогіі БДУ:**

*«Першачарговая задача, якую трэба будзе вырашаць абранаму парламенту, — пераадолець існуючую ў некаторых пластах беларускага грамадства апатыю, развіваць ініцыятыву. Людзі павінны адчуваць дачыненне да таго, што адбываецца ў краіне. У гэтым важная роля парламента як прадстаўнічага органа ўлады. Дэпутаты павінны выяўляць інтарэсы на месцах, прадстаўляць іх не толькі на высокім, але і на мясцовым узроўні. Гэта паслужыць і справе ўмацавання гуманітарнай бяспекі».*

# «ГЭТА НАША КРАІНА, І МЫ БУДЗЕМ ВЫЗНАЧАЦЬ, ЯК ЁЙ БЫЦЬ ДАЛЕЙ»

## Прэзідэнт правёў нараду з актывам Мінскай вобласці



**Насуперак пратаколу і традыцыям: учора кіраўнік краіны асабіста прадставіў калектыву Мінскага аблвыканкама новага кіраўніка Аляксандра Турчына, кандыдатура якога зацверджана напярэдадні на пазачарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Былы старшыня выканаўчага камітэта Анатоль Ісачанка будзе выконваць абавязкі ўпаўнаважанага Прэзідэнта па Мінскай вобласці. Гэта, дарэчы, унікальны выпадак, калі Прэзідэнт пакідае былога кіраўніка вобласці на такой пасадзе. Больш за тое, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што плануе назначыць Анатоля Ісачанку членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Сярод некалькіх кандыдатур, якія прапаноўваліся на пасаду кіраўніка рэгіёна, Прэзідэнт выбраў Аляксандра Турчына. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што новы губернатар — сталы кіраўнік, падрыхтаваны для вырашэння самых вострых пытанняў, не чужы для Міншчыны. Пры назначэнні кіраўнік краіны нагадаў пра важнасць работы з кадрамі. Ён папярэдзіў: сітуацыя ў краіне такая, што паслабленняў кіраўнікам не будзе.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Беларуская чыгунка прызначыла 88 дадатковых цягнікоў на навагоднія і калядныя святы.**
- Беларускі аўтобус выпрабоўваюць у Казані для сістэмы хуткаснага гарадскога транспарту.



- **Цэнтр тэсціравання па рускай мове як замежнай адкрыўся ў Мінску.**
- Дзяржпакет акцый Пріорбанка будзе выстаўлены на аўкцыён.
- **Па Гродзенскай вобласці падарожнічае бязвізавы турыст Дзед Мароз.**



- Веласцежку ўладкоўваюць уздоўж ракі Мухавец у Брэсце.

# Добры зачын на будучыню

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. МЯСНІКОВІЧА на заключным пасяджэнні сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Сёння завяршае работу шостае скліканне Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. А значыць, можна падвесці асноўныя вынікі нашай дзейнасці.

За час работы склікання адобрана 283 законы, прынята да ведама 15 дэкрэтаў. Сенатарскі корпус актыўна ўдзельнічаў у вырашэнні найважнейшых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, пастаўленых кіраўніком дзяржавы. У дзяржаўныя органы накіравана больш за 70 ініцыятыў Савета Рэспублікі па ключавых прыярытэтах пяцігодкі: занятасць, інвестыцыі, экспарт, лічбавізацыя, маладзёжная палітыка. Большасць з іх знайшла адлюстраванне ў нарматыўных прававых актах па лібералізацыі бізнесу, сумесным плане дзеянняў урада і Нацыянальнага банка на 2020 год. Хачу падзякаваць кожнаму з вас за актыўную дзяржаўную пазіцыю, вашы прапановы.

Многія задачы, якія стаялі перад Саветам Рэспублікі, удалося вырашыць дзякуючы канструктыўнаму і зладжанаму ўзаемадзеянню з урадам, дзяржорганамі, мясцовымі органамі ўлады. У сваёй дзейнасці мы абапіраліся на думкі кіраўнікоў прадпрыемстваў, навукоўцаў, экспертаў. З іх удзелам праведзена больш за 40 мерапрыемстваў Савета Рэспублікі: круглых сталоў, пасяджэнняў секцый навукова-кансультатыўнага савета, выязных пашыраных пасяджэнняў, парламенцкіх слуханняў.

СТАР. 3

# Задачы, пастаўленыя краінай, выкананы

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на закрыцці сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя калегі!

Заключная сесія Палаты прадстаўнікоў шостага склікання, а разам з ёй і чарговы парламенцкі цыкл падыходзяць да свайго завяршэння.

Уся наша дзейнасць была падпарадкавана абароне суверэнітэту, забеспячэнню ўстойлівага развіцця краіны, сацыяльнай стабільнасці і росту дабрабыту грамадзян — усяму таму, што складае аснову намечанага кіраўніком дзяржавы і адобранага народам палітычнага курсу.

Бачным вынікам праведзенай работы з'яўляюцца больш за 280 законаў, якія ахопліваюць усе сферы жыцця дзяржавы і грамадства.

Найважнейшымі заканадаўчымі прыярытэтамі для нас былі забеспячэнне дынамічнага развіцця эканомікі, павышэнне яе канкурэнтаздольнасці і зніжэнне ўразлівасці да ўздзеяння знешніх фактараў.

Гэтым мэтам паслужыла ўдасканальванне заканадаўства ў інвестыцыйнай, бюджэтна-падатковай, фінансавай сферах, розных галінах рэальнага сектара эканомікі і сферы паслуг.

Адзін з галоўных крытэрыяў здаровага дзелавога клімату — празрыстасць і стабільнасць падатковых правілаў. Унёскам дэпутатаў у вырашэнне гэтай задачы сталі новы Падатковы кодэкс і аптымізацыя механізмаў прыцягнення прыватнага капіталу ў буйныя інфраструктурныя праекты.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ГЭТА НАША КРАІНА, І МЫ БУДЗЕМ ВЫЗНАЧАЦЬ, ЯК ЁЙ БЫЦЬ ДАЛЕЙ»



Фота БелТА.

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падчас сур'ёзнай размовы гаворка зайшла пра галоўныя праблемы не толькі вобласці, але і краіны ў цэлым, былі пастаўлены задачы, якія патрабуюць самай пільнай увагі. Акцэнт зроблены на найвастрэйшых пытаннях.

## ШТО ВЫРАШАЮЦЬ КАДРЫ

Прэзідэнта непакоіць, што, нягледзячы на наяўнасць рэзерву (209 чалавек), сёння ў вобласці існуе 47 вакансій на пасады кадравага рэестра аблвыканкама і райвыканкамаў.

«На які станоўчы вынік можна разлічваць, калі адсутнічаюць кіраўнікі? І ўвогуле, навошта тады такі рэзерв? Напрыклад, як можа працаваць Вілейскі райаграсэрвіс, калі пасада дырэктара не занятая з 2015 года?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік краіны.

Ён абураны тым, што толькі сёлета па дыскрэдытуючых падставах звольнена 12 кіраўнікоў, тры з якіх з'яўляліся першымі асобамі раёнаў. Усяго за пяць мінулых гадоў 69 кіраўнікоў рознага ўзроўню скампраметавалі сябе і былі вызваленыя ад пасад.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу новага кіраўніка Міншчыны на гэтыя праблемы і патрабаваў сур'ёзным чынам навесці парадак у рабоце з кадрамі.

«Не будзе людзей, моцных кіраўнікоў, — мы нічога не зможам зрабіць у вобласці і вырашыць задачы, якія сёння перад намі стаяць. Тым больш што эканамічнае развіццё рэгіёна наўпрост залежыць ад якаснага складу кіраўнічай вертыкалі», — заключыў Прэзідэнт.

## ДА КОЛЬКАСЦІ — ЯКАСЦЬ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адзін з галоўных крытэрыяў, які сведчыць аб развіцці тэрыторый, — гэта колькасць насельніцтва. На Міншчыне яна прырастае, і ўслед за ёй (няхай і няшмат) прырастае колькасць занятых у эканоміцы. Сёння іх амаль 700 тысяч чалавек. «Такія тэндэнцыі кардынальна адрозніваюцца ад тых, якія, на жаль, назіраюцца ў Беларусі. За гэта можна толькі пахваліць», — звярнуўся да актыву вобласці Прэзідэнт.

Па яго словах, доля Мінскай вобласці ў агульнарэспубліканскіх паказчыках складае ад 15 да 30 працэнтаў. Валавы рэгіянальны прадукт прырастае самымі высокімі ў краіне тэмпамі (104,5 працэнта). За дзве пяцігодкі эканоміка рэгіёна вырасла амаль на 37 працэнтаў, у той час як рост у цэлым па краіне склаў усяго 10 працэнтаў.

«Па сутнасці, Міншчына — адзіная вобласць, дзе выконваецца маё патрабаванне аб апераджальным (у параўнанні з сусветным) эканамічным росце. Развітая прамысловасць, чвэрць сельскагаспадарчай вытворчасці, пятая частка экспарту і інвестыцый краіны — усё гэта, безумоўна, сведчыць пра найвышэйшы патэнцыял. Сёння ў вобласці няма «надзвычайшчыны» або нейкіх крытычных праблем. Але для новага старшыні аблвыканкама гэта толькі ўскладняе задачы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніка дзяржавы перш за ўсё насцярожвае скарачэнне колькасці арганізацый у эканоміцы (за год яна зменшылася на 210 адзінак). Адначасова ёсць пэўны рост напружанасці на рынку працы. Колькасць звольненых работнікаў (94 тысячы) перавысіла колькасць прынятых больш чым на восем тысяч. У параўнанні з мінулым годам на 18 працэнтаў скарацілася колькасць працаўладкаваных за кошт новых вытворчасцяў.

«Уважліва разбярыцеся ў прычынах гэтага становішча. Гэта збег абставін ці негатыўная тэндэнцыя? Звярніце ўвагу і на якасны склад суб'ектаў гаспадарання, якія фарміруюць эканоміку нашай вобласці», — звярнуўся да новага кіраўніка рэгіёна Аляксандр Лукашэнка.

Ён выказаў занепакоенасць, што вобласць спынілася ў вырашэнні пытання дыверсіфікацыі крыніц росту. Колькасць малых і сярэдніх арганізацый з 2013 года застыла на ўзроўні 20 тысяч, а колькасць работнікаў скарацілася са 143 тысяч да 124 тысяч чалавек.

«Патрабую актывізацыі дзелавой актыўнасці і павышэння ўнёску прадпрымальніцтва ў эканоміку рэгіёна. Распаўсюдзіўшы новыя прадпрыемствы па ўсёй тэрыторыі, вы вырашыце праблему раўнамернасці развіцця вобласці, а не толькі, як кажуць у народзе, «залатых зямель» паміж першай і другой кальцавымі дарогамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ЗА ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

«Усе імкнуцца сюды: калі не ў Мінск, то побач. Мінскі раён бачыце ў што ператварылі, хоць я ў апошні час на жорсткі кантроль узяў да кавалка зямлі. З другога боку, паглядзіце, колькі ў нас недабудаваных будынкаў, памяшканняў. Людзі просяць зямельны ўчастак — і доўгі час не займаюць яго. А дамаўляліся, што два-тры гады — і дом мусіць стаяць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. У працяг тэмы ён звярнуў увагу і на добраўпарадкаванне, асабліва сельскіх населеных пунктаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кіраўнікі сельскіх Саветаў у гэтым плане недапрацоўваюць.

Ёсць раёны, дзе якасць і ўзровень жыцця насельніцтва трэба павысіць, — Клецкі, Капыльскі, Любанскі, Уздзенскі. Прэзідэнт паставіў задачу: за вясну—лета наступнага года іх жыхары павінны адчуць змены ў лепшы бок. І ў вобласці для гэтага ўсё ёсць.

## ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ — ГАЛОЎНЫ ТРЭНД

Аляксандру Турчыну Прэзідэнт прапанаваў скарыстацца досведам працы ва ўрадзе для развіцця рэгіёнаў на аснове індустрыялізацыі (а дзе гэта магчыма — абавязковай лічбавізацыі).

«Лічбавізацыя эканомікі — галоўны сусветны трэнд. І гэта не значыць, што яна павінна быць толькі недзе ў Мінску, ва ўрадзе. Навукаёмістасць нават у сельскай гаспадарцы не павысіш без гэтага кірунку», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

## КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ

Каб у сельскай гаспадарцы былі спецыялісты, растлумачыў Аляксандр Лукашэнка, з імі трэба працаваць, пачынаючы са школы: выбраць некалькіх чалавек, накіраваць на вучобу ў сельскагаспадарчыя ВНУ, дамовіцца аб вяртанні дадому, даць стыпендыю.

«З задавальненнем вернецца ў раён. І гэта вернецца ваш чалавек, які ведае гаспадарку. Але ён вернецца, калі будзе больш-менш зарплата і абавязкова — дом, дзе ён можа жыць. Вось з гэтага трэба пачынаць», — абазначыў прыярытэты Прэзідэнт.

На Міншчыне, адзначыў ён, таксама хапае зямель, дзе трэба прадметна працаваць, — гэта задача старшынь райвыканкамаў разам з кіраўнікамі гаспадарак пад кантролем старшыні аблвыканкама.

Кіраўнікі ведаюць, што бюджэтных грошай на будаўніцтва прадпрыемстваў не будзе. Гэтыя сродкі прызначаныя для людзей, падкрэсліў Прэзідэнт. «А ў нас ужо многія прадпрыемствы, асабліва прамысловыя, нагой дзверы адчыняюць ва ўрад, штурмуюць — давайце грошы. А ўрад, як паштальёны, Прэзідэнту перакідвае праекты ўказаў, распараджэнняў аб выдзяленні грашовых сродкаў. Што гэта за практыка? Прадпрыемства мусіць працаваць, забяспечваць сваіх людзей зарплатамі, падтрымліваць іх і далей», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. Звярнуў ён увагу і на замежныя інвестыцыі: нельга выпускаць з поля зроку завяршэнне значных праектаў, якія рэалізуюцца на тэрыторыі вобласці.

Кіраўнік краіны перакананы: усё гэта новыя пункты ўмацавання абласнога патэнцыялу і яго пастаноўкі на інавацыйныя рэйкі.

## ПАЛІЧЫМ ГРОШЫ

Сярэдняя зарплата ў рэгіёне ўстойліва перавышае тысячу рублёў, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, і яна павінна працягваць расці, асабліва ў Вілейскім, Бярэзінскім, Капыльскім, Мядзельскім, Валожынскім раёнах.

«У Мінскай вобласці адзначаецца той жа недахоп, што і ў іншых рэгіёнах краіны: дыспрапорцыя паміж ростам заработнай платы прыкладна ў 109 і ростам прадукцыйнасці працы каля 105 працэнтаў. Думайце, як будзем гэта ліквідаваць у самы бліжэйшы час», — звярнуўся да актыву вобласці кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў ранейшую актуальнасць праблемы своечасовай выплаты заработнай платы (паводле інфармацыі Генеральнай пракуратуры, на 1 лістапада запазычанасць мелася на трох арганізацыях і складала амаль 2,5 мільёна рублёў).

«Мы калісьці казалі людзям (я ад вашага імя казаў), што мы будзем старацца падцягнуць сярэднюю зарплату па краіне да тысячы рублёў. Гэта кроў з носу трэба зрабіць, і мы гэта зрабілі. Трэба цяпер паглядзець на нізкааплатныя слаі насельніцтва, якія нясуць вельмі сур'ёзную нагрузку. Санітаркі, нянечкі, тыя ж медсёстры ў бальніцах, у дзіцячых садках... Вы ж разумееце, якая гэта каласальная праца — глядзець чужое дзіця і несці за яго адказнасць. На працягу гэтага года мы пакрыху падцягвалі іх зарплату, але гэтага недастаткова», — падкрэсліў Прэзідэнт. Пры гэтым, адзначыў ён, прэтэндаваць на абяцаныя пяцьсот долараў можна толькі пры поўнай працоўнай загрузцы.

Прымыканне раёнаў вобласці да сталіцы вызначае іх непарыўную сувязь з развіццём Мінска. На думку Прэзідэнта, неабходна вырашыць пытанне вынасу з Мінска буйных прамысловых прадпрыемстваў, выкарыстаўшы іх патэнцыял для падтрымкі раёнаў, якія адстаюць.

Асаблівую ўвагу ён запатрабаваў удзяліць развіццю гарадоў-спадарожнікаў сталіцы і перш за ўсё стварэнню ўмоў для «маятнікавай міграцыі» паміж імі і Мінскам. Для гэтага неабходныя сучасныя і прадуманыя транспартныя рашэнні.

## ПАЧУЦЬ І ЗРАЗУМЕЦЬ

Падчас нарады гаворка зайшла і пра глабальныя выклікі, якім сёння падвяргаецца дзяржава.

«Гэта наша краіна, і мы з вамі будзем вызначаць, як ёй быць далей. Але ні ў якім разе нельга растапыранымі пальцамі трымаць уладу. Бо будзем пажынаць плады, як у нашых суседзяў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што выбраны парламент не горшы, чым у былыя гады, можа, і лепшы. У адказ, лічыць Прэзідэнт, неабходна чуць людзей і адказваць на іх чаканні і просьбы.

«Я разумею, што ёсць некаторыя штатныя скаржнікі, але іх нязначная меншасць. Многія людзі прыходзяць таму, што ім няма каму дапамагчы. І яны маюць права разлічваць на ўладу. Памятайце, што сёння мы з вялікімі партфелямі, а заўтра будзем звычайныя людзі. Каб не было вельмі балюча за гэтыя гады перад народам. І каб у нас потым палкамі не кідалі за цяперашняе стаўленне да тых людзей, якія нас паставілі на гэтыя пасады. Усіх нас — ад Прэзідэнта да дзяржаўных служачых, якія тут сядзяць», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Аляксандр Лукашэнка.

## СТВАРЫЛІ? ЗАХАВАЦЬ!

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што ў будучыні стануць важныя не столькі прыродныя рэсурсы, якімі валодае тая ці іншая краіна, колькі інтэлектуальны патэнцыял, узровень адукацыі.

«Нафта і газ адыходзяць. Мазгі будуць галоўныя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт таксама выказаўся за тое, каб да ўлады прыходзіла новае пакаленне.

«Каб мы спакойна маглі, гледзячы на сваіх дзяцей, якія будуць кіраваць гэтай краінай (я не пра сваіх дзяцей кажу, мае дзеці не будуць кіраваць краінай, гэта я вам паабяцаў)... Каб нашы дзеці жылі ў гэтай краіне і радаваліся, што мы ім падарылі гэту суверэнную і незалежную краіну», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён канстатаваў, што пэўныя сілы часам спрабуюць рознымі метадамі расхістаць яе.

«Мы гэтага не павінны дазволіць. І гэтыя парламенцкія выбары паказалі, што мы гаспадары ў краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Сярод пытанняў, разгледжаных на пасяджэнні, былі і блізкія кожнаму — выхаванне дзяцей, магчымасць купляць экапрадукты, будучыня IT-акадэміі.

**Варвара МАРОЗАВА.**



# Добры зачын на будучыню

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павышэнню якасці заканатворчага працэсу закліканы садзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах», у падрыхтоўку якога Савет Рэспублікі ўнёс шмат сістэмных ініцыятыў. Нашы прапановы па прагназаванні наступстваў прыняцця законапраектаў, уключаючы ацэнку іх рэгулюючага ўздзеяння на ўмовы прадпрымальніцкай дзейнасці, пакетным прынцыпе падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў, правядзенні прававога маніторынгу ўлічаны і па сваёй сутнасці з'яўляюцца інавацыйнымі ў законапраектнай дзейнасці.

Сур'ёзная работа праведзена па ўдасканаленні заканадаўства ў інвестыцыйнай, бюджэтна-падатковай, фінансавай сферах. Прапановы Савета Рэспублікі выкарыстаныя Саветам Міністраў пры дапрацоўцы пакета прагнозных дакументаў на 2020 год, фарміраванні Праграмы дзейнасці ўрада на 2018—2020 гады, плана дзеянняў па стварэнні ўмоў для развіцця эканомікі, у іншых сістэмных дакументах.

Значная частка разгледжаных нарматыўных прававых актаў накіравана на забеспячэнне эфектыўнасці рэальнага і фінансавага сектараў эканомікі. Гэта законы аб інвестыцыйных фондах, аб натуральных манаполіях, валютным рэгуляванні і валютным кантролі, электрасувязі, супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі і многія іншыя.

У Савет Міністраў унесены прапановы па ўдасканаленні заканадаўства ў сферы ўладальніцкага нагляду, распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, прававога рэгулявання карпаратыўнай адказнасці кіраўнікоў гаспадарчых таварыстваў і членаў іх калегіяльных органаў кіравання.

Члены Савета Рэспублікі ўзялі актыўны ўдзел у распрацоўцы новай рэдакцыі Падатковага кодэкса і ўзгадненні пазіцый дзяржаўных органаў і бізнес-суполкі па гэтым важным нарматыўным прававым акце. Пасяджэнне прэзідыума навукова-кансультатыўнага савета, якое мы правялі ў Магілёве ў верасні 2019 года з шырокім колам удзельнікаў, дазволіла вызначыць далейшыя кірункі ўдасканальвання падатковага заканадаўства.

Значны блок законаў, адобраных Саветам Рэспублікі, нацэлены на вырашэнне пытанняў у сацыяльнай сферы. У іх ліку папраўкі ў Працоўны кодэкс і новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса. Многія нашы прапановы ўлічаны пры карэкціроўцы заканадаўства ў галіне аховы здароўя, адукацыі, навукі, турызму.

Ключавой ініцыятывай шостага склікання стаў маніторынг заканадаўчага забеспячэння рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, іншых найважнейшых рашэнняў кіраўніка дзяржавы.

Калегі!

Асобая ўвага Саветам Рэспублікі як палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь удзялялася пытанням рэгіянальнай палітыкі. Ва ўрад накіраваны сістэмныя прапановы па паскораным развіцці рэгіёнаў, асабліва тых, што знаходзяцца ў аб'ектыўна складаных эканамічных умовах. Прапанаваныя меры, якія спрыяюць іх самаразвіццю, наданню адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам большай эканамічнай самастойнасці і інш.

Гэтыя ініцыятывы былі выпрацаваны на аснове аналізу стану спраў на месцах, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці, дзе я з'яўляюся ўпаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы.

Хачу таксама адзначыць работу членаў Савета Рэспублікі па вырашэнні мясцовых задач: добраўпарадкаванне, ЖКГ, павышэнне якасці аказання медыцынскіх паслуг, удасканальванне сістэмы адукацыі і інш. Усяго сенатарскім корпусам шостага склікання праведзена каля чатырох тысяч асабістых прыёмаў грамадзян, разгледжана амаль 16 тысяч зваротаў.

Актыўна развівалася наша супрацоўніцтва з мясцовымі Саветамі дэпутатаў. Усебакова вывучалася і падтрымлівалася дзейнасць асацыяцый, якія аб'ядноўваюць шэраг Саветаў дэпутатаў. Разлічваем, што назапашаны вопыт будзе карысны для Савета Рэспублікі сёмага склікання.

Найважнейшы прыярытэт для Савета Рэспублікі — работа з моладдзю. Нашы намаганні былі накіраваныя на развіццё маладзёжнага парламентарызму, падтрымку яркіх і таленавітых хлопцаў і дзяўчат, якія імкнуцца быць карыснымі сваёй краіне. Разлічваем на тое, што сёмае скліканне працягне гэту дзейнасць. Міжпарламенцкая асамблея СНД беларускі парламенцкі досвед работы з моладдзю рэкамендавала для выкарыстання краінам Садружнасці.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Насычаным быў міжнародны парадак дня шостага склікання. Упершыню Мінск стаў пляцоўкай для правядзення маштабных міжнародных парламенцкіх мерапрыемстваў — Парламенцкай асамблеі Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, пасяджэння Бюро Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства, Міжнароднага форуму нацыянальных каардынатараў па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

Традыцыйна пад эгідай Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі праводзіліся форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі, у рамках якіх падпісаны дзясяткі буйных камерцыйных кантрактаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве. У Мінску прайшоў І Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана. Пры садзейнічанні Савета Рэспублікі адбыўся Беларуска-Польскі дзелавы форум «Добрасуседства-2019». Усе гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі ўмацаванню міжнародных сувязяў з нашымі партнёрамі, павышэнню ролі міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

Цяперашняя сесія праходзіць напярэдадні 20-годдзя Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Савет Рэспублікі рабіў усё, што ад яго залежыць, каб развіццё інтэграцыі ажыццяўлялася з улікам нацыянальных інтарэсаў і строга на аснове прынцыпаў, закладзеных у Дагавор.

1 студзеня 2020 года споўніцца пяць гадоў Дагавору аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Старшынства Беларусі ў органах ЕАЭС у 2020 годзе павінна надаць імпульс развіццю гэтага рэгіянальнага аб'яднання. Такая задача пастаўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам. ЕАЭС павінен стаць паўнавартасным эканамічным саюзам з роўнымі ўмовамі для ўсіх удзельнікаў. Наперадзе вялікая работа па фарміраванні агульнага рынку без выключэнняў і абмежаванняў. Трэба павышаць прэстыж ЕАЭС, узмацняць яго ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці дзяржаў-членаў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У наступным годзе мы адзначым 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Свята Перамогі было і застаецца свяшчэнным для людзей усіх пакаленняў. Савет Рэспублікі ўхваліў законапраекты, накіраваныя на ўзмацненне барацьбы з прапагандай нацызму і экстрэмізму, у тым ліку на ўзмацненне адказнасці ў гэтай сферы.

Паважаныя калегі!

За час работы ў парламенце вы атрымалі добры вопыт заканатворчай, міжпарламенцкай, кіраўніцкай дзейнасці. 30 членаў Савета Рэспублікі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі.

У склад сёмага склікання ўвайшлі 11 членаў Савета Рэспублікі шостага склікання. Спадзяёмся, што дзякуючы іх намаганням той зачын, які намі напрацаваны, будзе карысны і знойдзе эфектыўнае прымяненне ў рабоце нашых калег.

Разлічваем, што вы падзеліцеся сваім вопытам і ведамі з членамі Савета Рэспублікі новага склікання, працягнеце займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю і застанецеся для Савета Рэспублікі надзейнымі памочнікамі ў сваіх рэгіёнах.

Дзякуй вам за работу!

Жадаю вам, вашым родным і блізкім здароўя, дабрабыту, поспехаў ва ўсіх пачынаннях.

# Задачы, пастаўленыя краінай, выкананы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праведзена дастаткова аб'ёмная работа па развіцці прадпрымальніцтва. Яна закранула шырокі спектр пытанняў, у тым ліку зняцце адміністрацыйных бар'ераў, дэкрымiналізацыю эканамічнай дзейнасці, удасканальванне працоўных адносін і пашырэнне магчымасцяў самазанятасці.

Шэраг законаў быў прыняты ў мэтах развіцця ІТ-сектара, больш эфектыўнай рэалізацыі транзітнага патэнцыялу краіны, падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу ў сельскай мясцовасці.

Вялікі комплекс пытанняў вырашаны ў галіне сацыяльнай палітыкі. Нашы намаганні былі накіраваныя на падтрыманне належнага ўзроўню жыцця грамадзян, развіццё чалавечага патэнцыялу, падтрымку найбольш неабароненых катэгорый насельніцтва.

Унесены запатрабаваныя змяненні ў законы па пытаннях жыллёвых адносін, аказання жыллёва-камунальных і сацыяльных паслуг, пенсійнага забеспячэння, дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, ветэранаў і інвалідаў.

Акрамя таго, трэба згадаць мадэрнізацыю заканадаўства аб ахове здароўя і рэалізацыю некалькіх дэпутацкіх заканадаўчых ініцыятыў у сферы экалогіі.

Парламентарыі аператыўна рэагавалі на ўзнікненне пагроз нацыянальнай бяспецы і грамадскаму дабрабыту. Тут нам нярэдка даводзілася ісці на даволі жорсткія і рашучыя меры. Але менавіта такая пазіцыя, напрыклад, дапамагла знізіць градус наркатычнай пагрозы і абараніць нашу моладзь.

Зразумела, многія законапраекты мелі шырокі грамадскі рэзананс. Таму работа над імі праводзілася максімальна адкрыта. Цеснае ўзаемадзеянне з экспертамі, практыкамі, прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў дапамагала нам знаходзіць рашэнні, якія забяспечваюць баланс інтарэсаў дзяржавы і грамадства.

У рамках гэтай работы асаблівая ўвага была ўдзелена перспектывам развіцця нацыянальнага заканадаўства, што ў комплексе з вынікамі вывучэння правапрымяняльнай практыкі стварае ніядрэнны зачын для новага складу дэпутацкага корпуса.

Тое ж самае можна сказаць і пра нашы напрацоўкі ў сферы парламенцкай дыпламатыі. Самай важнай падзеяй у гэтым плане не толькі для парламента, але і для ўсёй краіны з'явілася правядзенне ў 2017 годзе ў Мінску штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Прайшоўшы пад знакам ініцыятывы «Хельсінкі-2», яна сур'ёзна паўплывала на паляпшэнне атмасферы ўспрымання Беларусі за мяжой і ўмацавала рэпутацыю Мінска як надзейнай міжнароднай перагаворнай пляцоўкі.

Мы напрацавалі добрую базу для нарошчвання двухбаковых сувязяў, асабліва на еўрапейскім вектары. Наша дэлегацыя ўпершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі наведала з афіцыйным візітам Швейцарыю. Мы выйшлі на высокі ўзровень кантактаў з польскімі калегамі. Нам удалося аднавіць работу беларуска-брытанскай і беларуска-бельгійскай груп дружбы. Дынамічна развіваюцца нашы адносіны з парламентарыямі Германіі. І гэта толькі самыя наглядныя прыклады.

А ў цэлым нашы сувязі ахопліваюць практычна ўсе рэгіёны свету, што цалкам адпавядае прынцыпу шматвектарнасці беларускага знешнепалітычнага курсу.

Сёння мы кантактуем з заканадаўчымі органамі больш чым 80 краін. Акрамя таго, дэпутаты цяперашняга склікання могуць запісаць у свой актыў больш за 10 новых дакументаў, якія папоўнілі дагаворную базу двухбаковага супрацоўніцтва.

Мы змаглі сур'ёзна ўмацаваць свае пазіцыі ў міжпарламенцкай суполцы. Вынікам прызнання нашых намаганняў у ПА АБСЕ з'явілася аднагалосная падтрымка членамі гэтай уплывовай арганізацыі ўсіх трох рэзалюцый, падрыхтаваных па ініцыятыве Беларусі.

Больш канструктыўнымі сталі нашы ўзаемаадносіны з парламенцкім вымярэннем Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы і Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Пазітыўнымі вынікамі адзначана і работа па ўмацаванні інтэграцыйных сувязяў на постсавецкай прасторы, перш за ўсё ў рамках Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

За параўнальна кароткі час нам удалося аптымізаваць расходаванне сродкаў саюзнага бюджэту, выкананне сумесных праграм, прасунуцца ў вырашэнні некаторых праблем, звязаных з забеспячэннем роўнасці правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання двух краін.

Па лініі іншых постсавецкіх міжпарламенцкіх структур асаблівы акцэнт быў зроблены на раскрыцці патэнцыялу мадэльнай заканатворчасці. Перспектыўны план гэтай работы ў СНД на найбліжэйшыя два гады складзены з улікам нашых прапаноў.

У 2016 годзе Нацыянальны сход упершыню быў прадстаўлены ў якасці пастаяннага назіральніка на пасяджэннях Лацінаамерыканскага парламента. А да завяршэння склікання мы значна наблізіліся да вырашэння пытання аб атрыманні такога ж статусу ў Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора і Панафрыканскім парламенце.

Нарошчваючы сваю знешнепалітычную актыўнасць, дэпутаты спрыялі адкрыццю новых рынкаў, умацаванню гандлёва-эканамічных сувязяў, прасоўванню вобразу Беларусі як ІТ-краіны і важнага сувязнага звяна паміж усходняй і заходняй мадэлямі эканамічнай інтэграцыі.

Пры непасрэдным садзейнічанні парламентарыяў дынамічна развіваецца супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі і Узбекістана, устанаўліваюцца прамыя дзелавыя кантакты з бізнес-суполкай «далёкай дугі», рэалізуюцца кааперацийныя і інвестыцыйныя праекты ў Егіпце, Пакістане і Судане.

Зразумела, асобым клопатам дэпутацкага корпуса была непасрэдная работа з выбаршчыкамі. Жывыя стасункі з людзьмі, адкрыты дыялог з грамадзянскай супольнасцю дазвалялі нам аператыўна выходзіць на актуальныя заканадаўчыя ініцыятывы, садзейнічаць вырашэнню наспелых праблем рэгіёнаў і патрэб нашых грамадзян.

За гэтыя гады было разгледжана больш за 30 тысяч зваротаў, прынята звыш 33 тысяч чалавек. Дэпутаты дапамаглі сотням з іх уладкавацца на работу, прайсці перападрыхтоўку або стварыць свой бізнес. Многім прадпрыемствам аказана падтрымка ў пераадоленні фінансавых і вытворчых цяжкасцяў.

У рамках Года малой радзімы з удзелам парламентарыяў рэалізаваны комплекс ініцыятыў па добраўпарадкаванні гарадоў і вёсак, развіцці сацыяльнай інфраструктуры, рамонце мясцовых дарог, захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

Паважаныя калегі!

Хачу сардэчна падзякаваць вам за работу. Яе вынікі гавораць самі за сябе. Вы заўсёды знаходзіліся на вахах і справай даказвалі сваю адданасць Радзіме і народу Беларусі.

Вырашэнне многіх пытанняў давалася нам няпроста, патрабавала гранічнай канцэнтрацыі сіл і высокай адказнасці. Але шчырае імкненне прынесці карысць краіне і сваім выбаршчыкам, актыўная грамадзянская пазіцыя і ўменне працаваць у камандзе нязменна дапамагалі нам прасоўвацца да дасягнення пастаўленых мэт.

Не адцягваючыся на дарэмныя спрэчкі і самарэкламу, дэпутаты шостага склікання спакойна і па-дзелавому выконвалі свой прафесійны абавязак. Тым самым былі захаваны пераемнасць у рабоце Палаты прадстаўнікоў і традыцыі супрацоўніцтва з усімі ўдзельнікамі заканадаўчага працэсу, дзяржаўнымі органамі і структурамі грамадзянскай супольнасці.

Цяпер гэтую высакародную місію трэба будзе выканаць дэпутатам, якія працягнуць сваю дзейнасць у абноўленым складзе парламента. І я ўпэўнены — вы справіцеся.

Але і дэпутаты шостага склікання, якія завяршаюць ажыццяўленне сваіх паўнамоцтваў, не застануцца ўбаку ад агульнай справы. Бо дэпутат не бывае былым. І гэта не проста словы. Давер, аднойчы аказаны народам, нам даводзіцца апраўдваць усё жыццё.

Выклікі, якія паўстаюць перад краінай на сучасным этапе, патрабуюць кансалідацыі ўсіх здаровых сіл грамадства. А значыць, вашы вопыт і веды, паважаныя калегі, будуць запатрабаваныя.

Асобных слоў падзякі заслугоўваюць работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў, памочнікі дэпутатаў і ўсе, хто актыўна дапамагаў нам у нялёгкай дэпутацкай дзейнасці.

Ад усёй душы жадаю ўсім вам, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця, здзяйснення прафесійных і асабістых планаў і новых поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі.

Брыгады дабра

# ІДУЦЬ ТУДЫ, ДЗЕ НЕАБХОДНА ДАПАМОГА

**Сёння ў свеце адзначаецца Сусветны дзень валанцёраў. У Беларусі валанцёрскі рух сканцэнтраваны ў асноўным у грамадскіх аб'яднаннях, якія дапамагаюць хворым у анкалагічных і псіхіятрычных дыспансерах, дамах-інтэрнатах і іншых медыцынскіх і сацыяльных установах.**

Вялікую колькасць валанцёраў — 16 тысяч — аб'ядноўвае Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Другія Еўрапейскія гульні абслугоўвала 8,7 тысячы валанцёраў, пераважная большасць якіх — студэнты беларускіх ВНУ. Добраахвотнымі памочнікамі становяцца людзі самых розных прафесій — урачы, медсёстры, праграмісты, кіроўцы. І бескарысліва дапамагаюць у разнастайных сітуацыях: ад выратавання падчас прыродных і тэхнагенных надзвычайных сітуацый да простай тэлефоннай размовы з адзінокімі пажылымі людзьмі, якім неабходна падтрымка.

— Тое, што беларусы вельмі спагадлівыя людзі і гатовыя адгукнуцца на чужую бяду, прадэманстравала катастрофа прыроднага характару — ураган Хаўер, калі сотні нашых суайчыннікаў дапамагалі аўтамабілістам і іншым, хто трапіў пад удар стыхіі, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.**

Валанцёры Чырвонага Крыжа кругласутачна дзяжурылі і дапамагалі людзям падчас пераправы цераз Прыпяць (мост праз раку, які звязваў Жыткавічы і Тураў, трэснуў 7 снежня 2017 года, рух па ім адкрыўся пасля рэканструкцыі амаль праз год). У палатках былі арганізаваны абагрэў, гарачы чай і харчаванне, псіхалагічная дапамога.

Часта валанцёрамі становяцца работнікі прадпрыемстваў. Прыклад гэтаму — кампанія «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», супрацоўнікі якой з 2007 года ўдзельнічаюць у акцыі «Выратуем Ельню разам». Балотны масіў у Віцебскай вобласці — адзін з найбуйнейшых у Беларусі, яны выратоўвалі ад перасыхання праз установку плацін. Спачатку каля 50 плацін пабудавалі ўручную, а з 2015 года прамысловым шляхам узвялі яшчэ 46, што дазваляе затрымаць ваду ва ўнікальным прыродным комплексе.

**Алена КРАВЕЦ.**

Ёсць ідэя!

# ДАВАЙЦЕ СЯБРАВАЦЬ... КУЛЬТУРАМІ

**Днямі кіраўнік Цэнтра культуры «Віцебск» Глеб ЛАПІЦКІ падзяліўся планамі правядзення шэрагу праектаў, у тым ліку конкурсу прыгажосці. Як дырэктар «Славянскага базару ў Віцебску» ён лічыць, што акрамя гэтага фестывалю можна праводзіць, няхай і менш маштабныя, але вельмі насычаныя мерапрыемствы міжнароднага ўзроўню.**

Дні беларускай, рускай, латышскай, літоўскай, яўрэйскай, а таксама многіх іншых культур плануюць зладзіць у Віцебску ўжо налета. І ёсць каму іх арганізаваць: пры Цэнтры культуры «Віцебск» пачынаючы з 2003 года функцыянуе Цэнтр нацыянальных культур. Цяпер дзейнасць гэтай структуры актывізуецца, тым больш што прыйшла новая каманда маладых і ініцыятыўных арганізатараў. Ужо праведзены перамовы і абмеркаваны магчымасці супрацоўніцтва з дыпламатамі Латвіі, Індыі, Літвы, Эстоніі і іншых краін.

Асабліва чакаюць у Віцебску прадстаўнікоў культуры, бізнесу, улады з гарадоў-пабрацімаў — цесныя партнёрскія стасункі ў беларускага абласнога цэнтра наладжаны больш чым з 25 гарадамі.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ** падкрэсліў, што з Цэнтрам культуры «Віцебск» вядзецца вельмі плённае супрацоўніцтва. Новыя ідэі, безумоўна, будуць мець падтрымку з боку кіраўніцтва выканаўчай улады абласнога ўзроўню. Тым больш што практыка паказвае: актывізацыя культурнага супрацоўніцтва — гэта і пачатак новага вітка ў развіцці партнёрства і па пытаннях турызму, прадпрымальніцтва, эканамічнай сферы ў цэлым.

Адзін з першых праанансаваных праектаў — конкурс пад рабочай назвай Miss International («Міс сяброўства» або «Міс садружнасць»). Але гэта не будзе конкурс прыгажосці ў класічным разуменні. Сярод іншага задумана, што ўдзельніцы — прадстаўніцы розных дыяспар — «пазнаёмяць» членаў журы з нацыянальнымі стравамі, фальклорнымі нумарамі, нацыянальнымі касцюмамі і г. д. Што цікава, суддзі ацэняць і актыўнасць тых, хто будзе «хварэць» за сваіх зямлячак. Адназначна конкурс правядуць напярэдадні Міжнароднага жаночага свята. Пакуль жа агучана: за тытулы змогуць пазмагацца дзяўчаты ва ўзросце да 25 гадоў. Але арганізатары не выключаюць, што неабходныя ўмовы для ўдзелу могуць быць зменены. Магчыма, з часам правядуць аналагічныя конкурсы сярод хлопцаў.

Сярод пляцовак, якія прапануюцца для прэзентацый краін і культур, ужо згаданы Летні амфітэатр.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## КНДР папярэдзіла ЗША аб падрыхтоўцы для іх «падарунка да Каляд»



З такой заявай выступіў першы намеснік кіраўніка МЗС КНДР Ры Тхэ Сон, абвінаваціўшы ЗША ў зацягванні перагавораў па дэнуклearызацыі і ў выкарыстанні амерыканскімі палітыкамі гэтых перагавораў у сваіх мэтах. Паўднёвакарэйскае інфармагенцтва Yonhap трактуе словы намесніка міністра як пагрозу аднавіць выпрабаванні ядзернай зброі і міжкантынентальных балістычных ракет у выпадку, калі ЗША не вылучаць новых прапаноў па перагаворах з КНДР да канца года. Праз некалькі гадзін пасля заяў Ры Тхэ Сона спецпрадстаўнік ЗША па Паўночнай Карэі Стывен Біган запэўніў, што Вашынгтон не мае намеру адмаўляцца ад перагавораў з Пхеньянам па праблеме ядзернага раззбраення, перадала Yonhap.

## У Японіі арыштаваны адзін з верхаводаў якудза



Японская паліцыя арыштавала аднаго з кіраўнікоў групоўкі якудза «Кобе Ямагуці-гумі» па падазрэнні ў спробе забойства баевіка злачыннага аб'яднання, якое супернічае з імі. Па звестках следства, паведаміў тэлеканал NHK, 60-гадовы Хіродзі Накату спрабаваў застрэліць з рэвальвера прафесійнага гангстара, які атрымаў сур'ёзныя раненні. Інцыдэнт адбыўся на адной з вуліц партовага горада Кобе, дзе рэгулярна здараюцца сутычкі паміж варагуючымі кланамі якудза. Бандыцкія міжусобіцы разгарнуліся пасля таго, як у верасні 2015 года ад галоўнага ў Японіі гангстарскага сіндыката «Ямагуці-гумі» адкалолася досыць вялікая частка яго членаў, якія арганізавалі самастойнае аб'яднанне «Кобе Ямагуці-гумі» колькасцю каля трох тысяч чалавек. Кожная з гэтых груповак прэтэндуе на лідарства ў горадзе Кобе і на ўсім паўднёвым захадзе галоўнага японскага вострава Хансю. Колькасць «Ямагуці-гумі», па звестках паліцыі, цяпер складае каля дзевяці з паловай тысяч чалавек.

## Улады Самоа ўвялі рэжым надзвычайнага становішча з-за эпідэміі адру



Урад Самоа ўвёў рэжым надзвычайнага становішча ў краіне з-за эпідэміі адру, паведаміла выданне Samoa Global News са спасылкай на рэліз сакратарыята Кабінета міністраў. Колькасць ахвяр на Самоа дасягнула 60 чалавек, усяго зафіксавана больш за чатыры тысячы выпадкаў захворвання, паведамляе ўрад краіны. Паводле прэс-рэліза сакратарыята кабміна, усе прыватныя і дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы павінны быць закрыты. Пры гэтым падчас надзвычайнага становішча дазваляецца працаваць толькі бальніцам, моргам, паліцыі, пажарным і іншым аператыўным ведамствам. Улады падкрэслілі, што ўсе грамадзяне павінны чакаць вакцынацыі па месцы жыхарства. Ужо прышчэпленыя абавязаныя паведаміць асабістыя звесткі і дату правядзення вакцынацыі для ўнясення ў базу. Падчас масавай вакцынацыі прышчэпкі супраць адру ўдалося зрабіць 58 тысячам мясцовых жыхароў. Усё насельніцтва вострава складае каля 200 тысяч чалавек.

Без дурману

# АНАЛІЗУЙЦЕ ГЭТА!

## Як высветліць, ці прымае дзіця наркотыкі

**Спецыялісты папярэджваюць: ужыванне наркотыкаў не мае ўзроставага цэнзу — прымаць іх некаторыя дзеці пачынаюць нават у дзесяць.**

Звяртаюцца ж па дапамогу непаўналетнія і іх бацькі, калі малым ужо мінула 16. Да гэтага часу ў асобных дзяцей ужо складаецца наркатычная залежнасць. За год адзін нарказалежны можа прыцягнуць у свой «чароўны свет» 10—12 сяброў.

Спрабуюць наркотыкі дзеці за кампанію, з цікавасці або проста таму, што ім няма чым заняцца. Заўважыць гэта бацькі могуць не адразу, а, калі здараецца, і занепакоецца, што нешта не так, то адмаўляюцца прызнаваць гэта. У выніку губляецца час, і выправіць становішча бывае амаль немагчыма. Таму нарколагі, псіхолагі, настаўнікі скіраваны на аднолькава актыўную работу як з малалетнімі залежнымі, так і з іх бацькамі. Апошнія, на жаль, часта не хочуць далучацца да дапамогі, маўляў, вы спецыялісты — вось і ратуйце, а я не хачу, не ўмею і не магу.

Між тым толькі самыя блізкія людзі могуць першыя заўважыць праблему, і вельмі важна ўбачыць самую першую спробу.

— Калі ад дзіцяці не пахне алкаголем, але яно відавочна паводзіць сябе неадэкватна — гэта трывожны званок бацькам. Самы надзейны шлях праверыць, ці прымае малое наркотыкі, — здаць мачу, і рабіць гэта трэба тэрмінова, а не праз дзень-другі, — раіць **Людміла ШПАКОЎСКАЯ, загадчык падлеткавага аддзялення Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера.** — Пры гэтым лепш, калі дзіця не здагадваецца, што яго правяраюць. Можна, напрыклад, сказаць, што з паліклінікі званілі, прасілі здаць аналізы. А самі завязіце аналіз на даследаванне (платнае) у дыспансер, дзе працуюць кругласутачна і ананімна.

Іншы шлях — прыйсці з аналізам на прыём да нарколага (таксама ананімна) і расказаць аб праблеме. Урач сам завязе аналіз у дыспансер, і бацькам гэта абыдзецца бясплатна. А пасля нарколаг яшчэ пракансультуе пра вынікі даследавання.

У аптэках таксама павінны быць тэсты на вызначэнне наркотыкаў: марыхуаны, псіхастымулятараў і опіумных рэчываў. Аднак галоўнае для бацькоў не вызначыць, што менавіта прымае дзіця, а ці робіць яно гэта ў прынцыпе. Выкарыстоўваюць тэсты таксама праз мачу. Тое, што цяпер ужываюць падлеткі, выводзіцца з арганізма хутка, так што правяраць трэба тэрмінова, па «свежых слядах».

**Ірына СІДАРОК.**

Ну і ну!

## ХУЛІГАН ПАБІЎ ДОКТАРА І ПАПСАВАЎ АБСТАЛЯВАННЕ

**У вёску Пагранічная Камянецкага раёна прыйшла машына для планавага правядзення флюараграфіі. Людзі паступова падыходзілі, запісваліся на працэдуру абавязковага для кожнага даследавання органаў грудной клеткі.**

Бліжэй да абеду каля перасоўнага рэнтген-кабінета з'явіўся неспакойны наведвальнік. Спачатку ён прайшоў флюараграфію, а потым паспрабаваў нахабна заляцацца да медсястры, якая запісвала пацыентаў. У нейкі момант доктар паклікаў яе ў рэнтген-кабінет. Але зламыснік, замест таго каб адступіцца, накінуўся на ўрача з кулакамі, стаў біць яго, рваць халат. Тады хулігана змаглі адцягнуць прысутныя, а доктар тым часам зайшоў у кабінет і зачыніўся там. Але ж злыдзень пачаў біць рукамі і нагамі аўтамабіль, папсаваў электраабсталяванне.

Як паведаміла супрацоўніца Брэсцкага абласнога ўпраўлення УУС Аляксандра ЗАХАРАВА, нарад міліцыі прыбыў на выклік у Пагранічную і затрымаў 43-гадовага дэбашыра. Заведзена крымінальная справа. Яму пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## НЕ ХАЦЕЎ НА РАБОТУ — «ЗАМІНІРАВАЎ» ЗАВОД

**Увечары ў аператыўна-дзяжурную службу Баранавіцкага ГАУС паступіла паведамленне аб тым, што замініраваны завод «Атлант».**

На месца здарэння неадкладна выбылі следча-аператыўная і сапёрна-піратэхнічная групы, МНС, брыгада хуткай дапамогі. Было эвакуіравана 150 чалавек. У ходзе абследавання прадпрыемства спецыялістамі наяўнасць небяспечных прадметаў не выяўлена. Праз дзве гадзіны пасля паведамлення аб мініраванні работа завода была адноўлена.

Праваахоўнікамі ўстаноўлена, што званок у міліцыю паступіў з тэлефона, які знаходзіцца ў адной з кватэр у Баранавічах. Тэлефанаваў 43-гадовы мужчына, які з'яўляецца рабочым названага завода. Ён быў затрыманы па месцы жыхарства. Медыцынскім аглядам устаноўлена наяўнасць алкаголю ў выдыханым ім паветры ў канцэнтрацыі 1,8 праміле. Як патлумачыў падазраваны, прычына яго ўчынку — нежаданне ісці на работу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

5 СНЕЖНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15876)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Новы стары знаёмы*

# ПРЫЦЯГНЕННЕ «МАЛАДОСЦІ»,
## або Часопіс, які ўмее запальваць імёны



**З пачаткам новай падпіснай кампаніі ў «Маладосці» з'явіўся новы «прамоўшан»: цяпер гэта «больш чым часопіс». Пра падрабязнасці сённяшняй стратэгіі выдання расказвае яго галоўны рэдактар Святлана ВОЦІНАВА.**

***— Што значыць «больш чым часопіс»?***

— У літаральным сэнсе. І калі па сутнасці, то гэта ўжо не заяўка, не агучванне мэты, а здзейсненае, канстатацыя факта.

Даволі працяглы час, больш чым год, «Маладосць» нагадвае ядро, якое прыцягвае і вакол якога адбываецца няспыннае вярчэнне. Ядро культурнае, вярчэнне інтэлектуальнае. Неяк неўпрыкмет для саміх сябе мы атрымалі такі, працягваючы ядзерную тэрміналогію, «магнітны момант», што цяпер нам робяцца прапановы аб супрацоўніцтве часцей, чым робім іх мы. І гэта не можа не сведчыць пра актуалізаваную вядомасць выдання і сімпатыю да яго, тым больш што ў партнёрах — структуры аўтарытэтныя. Сярод найбольш яркіх супрацоўніцтваў — з розгаласам на ўсю краіну і даволі важкім творчым вынікам — можна назваць супрацоўніцтва з філалагічным факультэтам БДУ і Нацыянальным інстытутам адукацыі ў рамках конкурсу біяграфічных твораў, прысвечаных беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя, «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя», і супрацоўніцтва з Першым Нацыянальным каналам Беларускага радыё ў рамках літаратурнага праекта-конкурсу «Бацькаўшчына светлая мая», прысвечанага Году малой радзімы. Акрамя таго, мы партнёрствуем у конкурсе, які суправаджае вядомы ўжо фестываль «Горад і Кнігі». У якасці журы ацэньваем работы, якія дасылаюцца на не менш вядомы Рэспубліканскі конкурс літаратурнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі «Аўтограф». Маем непасрэднае дачыненне да вылучэння твораў на Міжнародны конкурс маладых пісьменнікаў «Першацвет». Апошнім часам сталі яшчэ і партнёрамі сеткавага конкурсу эсэ «Свет будучыні» партала mocny.by. Праз адны толькі конкурсы можна ўявіць, якое вярчэнне адбываецца ў рэдакцыі і вакол яе і як мы ўсе пазітыўна зараджаны.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

*Пары на парах*

# Калі на душы рай, інтэрнатам не пужай

**Пра шлюб звычайна гавораць так: пакуль на сабе не адчуеш — не зразумееш, што гэта такое. А вось маладая сям'я КАНАВАЛАВЫХ, дваццацігадовы Сяргей і дваццацітрохгадовая Марыя, ведаюць, аб чым размова. Больш за год таму яны ажаніліся і з таго часу жывуць у студэнцкім інтэрнаце. Як зараз дзеляць дамашнія абавязкі? Каго лічаць галоўным у сям'і? Аб гэтым і іншым мы даведаліся ў суразмоўнікаў.**

Магістрантка БДУІР Маша і чацвёртакурснік гэтай жа ВНУ Сяргей вучацца на адной кафедры — інжынернай псіхалогіі і эрганоміі, на факультэце камп'ютарнага праектавання. Але па розных спецыяльнасцях: у яе гэта «кіраванне бяспекай вытворчых працэсаў», у яго — «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі». Абодва героі родам з Брэста, нават вучыліся там у адной школе. Але пазнаёміліся толькі падчас паездкі ў Балгарыю, якую арганізавалі іх настаўнікі. Тады яны яшчэ не ведалі, што гэтая сустрэча — не выпадковасць.

— На той момант я ўжо скончыла школу, але былы класны кіраўнік прапанавала далучыцца да вучняў. Я з задавальненнем пагадзілася, — дзеліцца Маша. — З Сярожам упершыню мы загаварылі толькі падчас прагулкі каля мора: той быў са сваёй кампаніяй, а я са сваёй. Мне адразу спадабалася, як ён прыгожа гаворыць і ўдала жартуе.

— Так, Машу скарыла маё пачуццё гумару, а мяне — яе вочы, — успамінае з усмешкай хлопец.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***



*Крок да прафесіі*

# ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ — ДА НАС!
## Як маладзёжны дадатак дае дарогу будучым журналістам




**Пераможцы конкурсу сезона 2016/2017 *(злева направа):* Ангеліна Новікава, Валянціна Трубач, Ірына Бубнова.**

**Нядаўна ў БДУ адбыўся VII Форум маладых журналістаў «Развіццё айчыннай журналістыкі на сучасным этапе і яе адказнасць перад грамадствам». Мэтай яго правядзення было павышэнне прафесійных навыкаў у маладых калег па цэху. Удзельнікамі форуму сталі больш за сто журналістаў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ ва ўзросце да 30 гадоў, а таксама студэнты журфака. Яны абмеркавалі прававыя і этычныя асновы журналістыкі, шляхі вырашэння сацыяльных праблем, новыя тэндэнцыі і тэхналогіі сучаснай журналістыкі. Прысутнічалі на мерапрыемстве і прадстаўнікі «Выдавецкага дома «Звязда», што зусім не выпадкова.**

Шмат гадоў запар «Звязда» вядзе карпатлівую работу з таленавітай беларускамоўнай моладдзю, у прамым сэнсе слоў рыхтуючы для сябе будучых калег, — тое, што толькі нядаўна пачалі рабіць іншыя. Напрыклад, Юлія Адамовіч, сёлетняя выпускніца журфака, пачала супрацоўнічаць з маладзёжным дадаткам «Чырвонкай. Чырвонай зменай» яшчэ калі была школьніцай, прайшла ў ім усе вытворчыя практыкі, акрамя першай, азнаямленчай, якую студэнты звычайна праходзяць у раённых газетах. У пачатку чацвёртага курса Юля была залічана ў штат «Звязды». Сёння яна — малады спецыяліст найстарэйшага беларускамоўнага грамадска-палітычнага выдання, працуе ў аддзеле камп'ютарных сістэм і інтэрнэт-версіі газеты «Звязда», працягвае раз-пораз рыхтаваць матэрыялы для «Чырвонкі. Чырвонай змены».

Яшчэ адна сёлетняя выпускніца журфака, Дар'я Шлапакова, пачала супрацоўнічаць з маладзёжным дадаткам студэнткай, прайшла ў ім тры вытворчыя практыкі, у тым ліку пераддыпломную. Як і Юля, у пачатку чацвёртага курса была залічана ў штат «Звязды». Цяпер яна з'яўляецца спецыяльным карэспандэнтам аддзела навін і рэпартажаў і таксама працягвае актыўна рыхтаваць матэрыялы для маладзёжнага дадатку.

Адным з дзейсных метадаў па выяўленні і падтрымцы таленавітай моладзі з'яўляецца правядзенне творчага конкурсу для юных і маладых няштатных аўтараў. У «Чырвонцы. Чырвонай змене» апошнія гады ён праходзіў пад нязменнай красамоўнай назвай «Я малады. І мне не ўсё роўна!»

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
5 12 2019 г.

Не трапіць у сеткі

# ІНТЭРНЭТ І ГАДЖЭТЫ — ІНСТРУМЕНТ...

## ...які патрабуе выканання тэхнікі бяспекі

**Рэальная гісторыя, якая здарылася сёлета з юнай мінчанкай... Ёй у сацыяльнай сетцы ад незнаёмага кантакта з дзявочым профілем прыйшла прапанова — атрымаць бясплатныя сцікеры і «галасы». Яна пагадзілася, бо патрабавалася ўсяго толькі паведаміць новаспечанай «сяброўцы» нумар свайго тэлефона, пасля чаго пацвердзіць згоду пры дапамозе SMS. За пяць хвілін ёй прыйшло 18 такіх пасланняў, на якія дзяўчынка адказала. Кожная з іх каштавала шэсць рублёў. Але гэта стала вядома толькі пасля таго, як рахунак на тэлефоне апусцеў і дзяўчынка паведаміла пра здарэнне сваім бацькам. Тыя хутка звярнуліся ў праваахоўныя органы: акаўнт зламысніцы быў заблакаваны, а мабільны апаратар вярнуў амаль усе грошы. «Гэта добры канец гісторыі, але, на жаль, так здараецца далёка не заўсёды», — канстатуе Вольга КОРСУН, аўтар і кіраўнік сацыяльнага праекта «Інтэрнэт-бяспека дзяцей Беларусі. Netka.by».**
**Як абараніць свайго сына або дачку, не ставячы пад пагрозу іх давер? Як правільна наладзіць гаджэты падлетка, каб засцерагчы ад небяспечнага кантэнту? Якія метады выкарыстоўваюць маніпулятары ў сеціве, каб дамагчыся сваіх мэт? Пра ўсё гэта ішла размова на пятай гарадской канферэнцыі #GirlSafety, якую арганізавала Акадэмія крэатыўных тэхналогій IT Princess пры падтрымцы Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі.**

### Самыя неабароненыя

Ёсць статыстыка, паводле якой 44 % дзяцей праводзяць у сеціве больш за дзесяць гадзін у суткі. Даследаванні паказваюць, што найбольш уразлівая катэгорыя карыстальнікаў інтэрнэту — дзяўчаты-падлеткі. Яны значна больш адчувальныя да крытыкі, чым хлопчыкі. І калі нешта посцяць у сваіх акаўнтах у сацыяльнай сетцы, вельмі чакаюць «лайкаў» і пазітыўных каментарыяў. Менавіта дзяўчаты цяжка перажываюць псіхалагічныя праблемы: труцяць сябе таблеткамі, алкаголем, хімічнымі рэчывамі.

Па звестках «Лабараторыі Касперскага», на пытанне «Ці хвалюецеся вы, што інтэрнэт акажа негатыўны ўплыў на вашых дзяцей?» 95 % бацькоў у Расіі адказваюць: «Хвалюемся». Калі ж спытаць: «А што вы робіце, каб засцерагчы іх?», высвятляецца: большасць нічога не робіць — толькі хвалююцца. Між іншым, **58 % дзяцей паведамляе, што яны НЕШТА ХАВАЮЦЬ ад бацькоў з таго, што робяць у інтэрнэце.**

А вось вынікі апытання «Лабараторыі Касперскага», праведзенага нядаўна ў нашай краіне: у 57 % беларускіх дзяцей ва ўзросце ад сямі да дзевяці гадоў ужо ёсць уласны смартфон або планшэт. А да 15—18 гадоў іх колькасць вырастае да 97 %. Пра тое, што іх сыны і дочкі карыстаюцца тымі ці іншымі сацыяльнымі сеткамі, паведаміла 74 % бацькоў.

### Правілы «выжывання»

Адна з найбольш частых пагроз, з якімі дзеці і падлеткі сутыкаюцца ў сеціве, — крадзеж грошай. Вольга Корсун патлумачыла, як не трапіць у фінансавыя пасткі, на прыкладзе «казачнай гераіні» дзяўчынкі Алесі.

**Гісторыя першая. Да чаго цікаўнасць і страх Алесю прывесці могуць?**

— Адзін з самых распаўсюджаных відаў махлярства зусім немудрагелісты: дзіцяці прыходзіць паведамленне ў месенджары ці ў сацыяльных сетках, або на нейкім сайце малое бачыць, як усплывае акенца з прапановай: «Даведайся, хто заходзіў на тваю старонку "УКантакце"». Гэта можа быць таксама паведамленне пра тое, што выйшла нейкая сакрэтная серыя папулярнага серыяла (мультфільма), прапанова прайсці нейкі круты тэст, які ўжо выканалі ўсе сябры. Змест можа быць любы, галоўнае — зачапіць увагу дзіцяці, — папярэджвае Вольга Корсун. — Яно пераходзіць па спасылцы, а там яго просяць увесці свае даныя, сярод якіх ёсць нумар тэлефона. На апошні прыходзіць SMS з просьбай пацвердзіць, што ты не робат, або паведаміць пра свой узрост для атрымання кода актывацыі. І як толькі дзіця гэта зробіць, разам з SMS з яго тэлефона будуць спісаны сродкі. Ёсць два варыянты: у першым можа аднаразова «зляцець» з рахунку вялікая сума. У другім на ўладальніка нумара афармляецца без яго згоды платная падпіска: у такім выпадку грошы будуць спісвацца штодня, — гэта не так кідаецца ў вочы, але праз пэўны час бацькі будуць непрыемна здзіўлены тым, што рахунак пусты, і пачнуць высвятляць, куды маглі знікнуць фінансавыя сродкі.

Таксама махляры могуць сыграць на нашых страхах — дасылаюць паведамленне «Праверка бяспекі»: «Даведайся, ці ёсць твая картка ў базе хакераў». А далей прапануюць увесці яе нумар, код CVC2 ад карткі і націснуць «Праверыць». Так зламыснікі атрымліваюць доступ адразу да ўсіх грошай.

**Гісторыя другая. Стань самым крутым, або Як ганарыстасць дзяўчынцы Алесі нашкодзіла.**

Карыстальнік атрымлівае ў сеціве паведамленне кшталту: «Прапампуй свой статус у гульні!!!», «Атрымай супер-бонус!!!», «Падніміся ў рэйтынгу» і г. д. Пра тое, што паслуга платная, часцей за ўсё не згадваецца. Далей патрабуецца аўтарызавацца на сайце — увесці нумар мабільніка і адказаць на SMS або ўвесці код, атрыманы на сайце. Грошы спісваюцца, але ні статусаў, ні новых «крутасцяў» няма. Таму цяпер у доме Алесі з'явілася наступнае правіла: ніколі не ўводзіць нумар свайго мабільнага тэлефона і не адпраўляць SMS незнаёмцам, не абмеркаваўшы гэта з бацькамі.

### Бясплатны сыр

**Гісторыя трэцяя. Як Алеся па спасылках сумніўных пераходзіла.**

Дзіця атрымлівае ў сеціве паведамленне, дзе яго запрашаюць прайсці па спасылцы, каб пагледзець паштоўку, атрымаць падарунак, пралічыць сумяшчальнасць з аднакласнікам Максам і гэтак далей. Каб выклікаць давер, могуць выкарыстоўвацца ўзламаныя акаўнты сяброў ці фальшывы адрас адміністрацыі сайта. Вынік — спісаныя з рахунку грошы.

— Не ўпэўнены — не націскай! Любы ліст, SMS, галасавое паведамленне, якія штурхаюць да паспешлівых дзеянняў, павінны вас насцярожыць, — папярэджвае Вольга Корсун. — Не паддавайцеся на маніпуляцыі. Калі вам прапанова ці просьба сябра здалася падазронай, лепш асабіста звязацца з ім па тэлефоне.

**Гісторыя чацвёртая. Як дзяўчынцы Алесі незлічоныя багацці абяцалі.**

«Віншуем! Вы выйгралі суперпрыз!» — такія паведамленні атрымлівалі, напэўна, усе. Каб забраць свой падарунак, могуць папрасіць аплаціць нейкую «дробязь» — перасылку, мытныя пошліны і г. д. І калі падлетак мае доступ да карты, то цалкам магчыма, што ён можа перавесці 20 рублёў, каб атрымаць абяцаную тысячу! Або калі просяць адправіць SMS, то з рахунку спісваюцца грошы ці афармляецца платная падпіска.

**Гісторыя пятая. Як Алеся на шантаж і пагрозы паддалася.**

«Я ведаю, дзе ты жывеш. Калі не адправіш мне грошы, у цябе і тваіх бацькоў будуць праблемы», — дзіця такое паведамленне можа вельмі моцна напалохаць. Ці як варыянт: «Калі ты не заплаціш, то ўсе твае аднакласнікі і настаўнікі ўбачаць кампраметуючыя фоткі». Хутчэй за ўсё, ніякіх здымкаў у прыродзе не існуе або вымагальнік скарыстаўся фоташопам. Але хто будзе разбірацца, падробка гэта ці не? Усё роўна страшна за сваю «рэпутацыю».

— Таму ёсць вельмі важнае правіла, якога трэба абавязкова прытрымлівацца: я расказваю бацькам пра ўсе непрыемнасці, у якія траплю, а яны мяне слухаюць і вучаць, як зрабіць так, каб сітуацыя больш не паўтарылася, — канстатуе эксперт. — І, дарагія бацькі, што б ні здарылася, паспрабуйце ўстрымацца ад істэрыкі «я ж табе казаў (казала)!!!», а старайцеся разам разабрацца ў сітуацыі.

### Бязлітасны шопінг

**Гісторыя шостая. Сабралася неяк Алеся ў сеціва па пакупкі, ды і засталася без грошай.**

Каб больш гэтага не дапусціць, у доме дзяўчынкі з'явіліся і такія правілы:

1. Завядзіце банкаўскую картку, якую будзеце выкарыстоўваць толькі для пакупак у інтэрнэце. Не захоўвайце на ёй вялікія сумы і трымайце выключна з мэтай аплаты ў сеціве.



2. Карыстайцеся антывірусам. Такая праграма адразу пачне біць трывогу, калі сайт здасца ёй падазроным. Таксама яна будзе адсочваць з'яўленне на камп'ютары шкоднага праграмнага забеспячэння, якое можа выкрасці нейкія персанальныя звесткі.

3. Набывайце тавары толькі ў правераных месцах. А калі штосьці вельмі хочацца купіць у незнаёмай інтэрнэт-краме, папярэдне вывучыце водгукі іншых пакупнікоў.

4. Зрабіце скрыншот сайта.

5. Не ўводзьце лішніх звестак: лагіны, паролі ад банкаўскага кабінета ці пін-код ад банкаўскай карткі пры куплі ў інтэрнэце не патрабуюцца!

6. Карыстайцеся дадатковымі банкаўскімі паслугамі. Сёння ўсе банкаўскія ўстановы прапануюць SMS-інфармаванне аб аперацыях, якія былі здзейснены з вашай карткай. Гэта дазваляе кантраляваць уласныя грошы і хутка заблакаваць карту ў выпадку зламысных дзеянняў.

Між іншым, небяспека неабдуманых пакупак закранае і тых, хто цікавіцца анлайн-гульнямі: мяжа паміж віртуальнымі і рэальнымі грашыма хутка сціраецца. Пэўную небяспеку для сямейнага бюджэту ўяўляюць убудаваныя ў анлайн-гульні ўнутраныя пакупкі. Парада для бацькоў: каб засцерагчы сябе ад нечаканых выдаткаў, пераканайцеся, што дзіця не можа траціць грошы з вашай карткі, прывязанай да анлайн-гульні, калі яно ў яе зойдзе. Адна англійская дзяўчынка чатырох гадоў, пакуль бацька варыў ёй макароны, патраціла больш за тысячу фунтаў, прычым ругаць яе за гэта было бессэнсоўна: яна проста гуляла і нават не ведала, што марнуе грошы, націскаючы на «так» і «купіць».

Калі падлетак самастойна і свядома за свае грошы набыў нейкую цацанку ў анлайн-гульні, гэта нармальна. Галоўнае, каб ён мог патлумачыць, хоць у двух словах, навошта яна яму патрэбная і што ён збіраецца рабіць з «віртуальнай каштоўнасцю». Але калі ў падлетка прасочваюцца прыкметы інтэрнэт-залежнасці, гэта падстава задумацца, а чаго яму не хапае ў рэальным жыцці, і, магчыма, звярнуцца па дапамогу псіхолага.

7. Устанавіце дзіцяці ліміт на аплату тавараў і паслуг у інтэрнэце. У гэтым выпадку, нават калі вы станеце ахвярай махляроў, ёсць шанц пазбавіцца не ўсіх грошай адразу, а толькі невялікай сумы.

### Самае каштоўнае

**Гісторыя сёмая. Як Алеся навучылася фішынгавыя сайты распазнаваць.**

— Фішынг — гэта крадзеж канфідэнцыяльных звестак карыстальнікаў: ад адрасоў электроннай пошты да рэквізітаў плацежных картак, — тлумачыць Вольга Корсун. — Ашуканцы робяць гэта пад рознымі добрапрыстойнымі падставамі: аўтарызацыя на сайце, неабходнасць «адпісацца» ад спаму ў электроннай пошце, аплата пакупкі па нізкай цане або з вялікай зніжкай, неабходнасць устанавіць новую праграму. Каб ахвяра добраахвотна раскрыла свае персанальныя звесткі, зламыснікі могуць выкарыстоўваць фішынгавыя сайты. Апошнія маюць шэраг прыкмет, якія іх адразу выдаюць. Нават недасведчаны карыстальнік можа за некалькі хвілін вызначыць, ці варта давяраць сайту, на якім ён апынуўся, рэквізіты сваёй аплатнай карткі. Папулярныя сайты прымяняюць шыфраванне SSL для перадачы даных карыстальнікаў. Пры выкарыстанні гэтай тэхналогіі адрас пачынаецца на «https://». А вось калі сайт інтэрнэт-крамы пачынаецца на «http://», гэта нагода ўсумніцца ў арыгінальнасці старонкі. Насцярожыць павінны граматычныя, арфаграфічныя і дызайнерскія памылкі, адрозненне структуры старонак у параўнанні з арыгінальным сайтам.

— Інтэрнэт і гаджэты — гэта ўсяго толькі інструмент, ад якога ніхто ўжо не адмовіцца. Інструмент класны, але ён таксама патрабуе выканання пэўнай тэхнікі бяспекі і ўдумлівага выкарыстання, — рэзюмуе **каардынатар праекта GirlSafety, сузаснавальнік IT Princess Academy, педагог Валянціна ЧЭКАН.** — І калі мы заходзім у сеціва, варта памятаць: самае каштоўнае, што ёсць у нас і што трэба берагчы, — гэта персанальныя звесткі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Перспектывы*

# БУДУЧЫНЯ — ЗА ЛІЧБАВЫМ УНІВЕРСІТЭТАМ

**Міждысцыплінарны адукацыйны і даследчы цэнтр будзе створаны ў БДУ. Але займацца там змогуць таксама і студэнты іншых вышэйшых навучальных устаноў па асобных модулях і дысцыплінах. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ. Плануецца, што ў ім будуць развівацца прыкладна 16 навукова-даследчых кірункаў у галінах біятэхналогій, фізікі, хіміі і іншых.**



На конкурс «100 ідэй для Беларусі», ідэйным натхняльнікам якога выступае БРСМ, маладыя наватары падалі летась каля дзвюх тысяч заявак. З іх 107 дайшлі да фіналу.

«Матэрыяльна-тэхнічная база ўніверсітэтаў — адзін з ключавых рэсурсаў пры павышэнні якасці адукацыі, — падкрэсліў спікер. — Вялікі рывок мы хацелі б здзейсніць у гэтым кірунку за кошт рэалізацыі сумеснага праекта з Сусветным банкам, ад якога спадзяёмся атрымаць крэдыт на развіццё вышэйшай школы. Сродкі будуць накіраваны на мадэрнізацыю матэрыяльна-тэхнічнай базы 15 універсітэтаў — гэта сур'ёзныя ўкладанні, якія звязаны ў асобных выпадках са стварэннем новым прарыўных кірункаў».

Яшчэ адзін рэсурс для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў — інвестыцыі з боку прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў, зацікаўленых у падрыхтоўцы кадраў.

«Сёння ў гэтым кірунку досыць актыўныя кампаніі ПВТ, якія адкрываюць ва ўніверсітэтах свае навучальныя лабараторыі. Разлічваем таксама, што да іх далучацца і іншыя эканамічна паспяховыя арганізацыі. Хацелася б, каб яны ў аснову сваёй дзейнасці ставілі менавіта кадравую палітыку», — дадаў Сяргей Каспяровіч.

На сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з навуковай грамадскасцю ў Нацыянальнай акадэміі навук у красавіку 2017 года была прапанаваная канцэпцыя «Універсітэт 3.0». Яна прадугледжвае стварэнне ўнутры ВНУ інтэграванага адукацыйнага, навуковага і прадпрымальніцкага асяроддзя для камерцыялізацыі навуковых распрацовак, а таксама скіравана на павышэнне якасці і эфектыўнасці практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Сёння канцэпцыю развіваюць ужо восем вышэйшых навучальных устаноў. У перспектыве стаць удзельнікамі гэтага праекта павінны практычна ўсе ўніверсітэты. У ВНУ створаны ўсе ўмовы для правядзення даследчых работ і развіцця стартапаў. У мінулым навучальным годзе ў XXV рэспубліканскім конкурсе навуковых работ было прадстаўлена больш за 3,7 тысячы студэнцкіх работ, асабліва актыўныя былі даследчыкі з БДУ, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, БНТУ, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. У выніку аўтары 70 работ атрымалі званне лаўрэатаў, што падмацоўвалася разавай грашовай падтрымкай у памеры сямі базавых велічынь. Розныя матэрыяльныя стымулы прадугледжаны і для навуковых кіраўнікоў.

«Канцэпцыя «Універсітэт 3.0» не толькі дазваляе студэнтам лепш падрыхтавацца да прафесійнай дзейнасці, але і стымулюе да развіцця педагогаў. Памылкова лічыць, што выкладчык у ВНУ — гэта чалавек, які толькі перадае веды. Ён разам са студэнтам у першую чаргу даследчык», — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч.

Яшчэ адзін новы кірунак, да якога з цягам часу могуць далучыцца ўсё больш беларускіх ВНУ, — гэта канцэпцыя «лічбавага ўніверсітэта». Сёння лідарам у развіцці ініцыятывы з'яўляецца БДУІР, дзе digital-тэхналогіі актыўна ўкараняюцца не толькі ў вучэбнае асяроддзе, але і ў працэс кіравання ўніверсітэтам. Гэта дазваляе сістэматызаваць і апрацоўваць даныя, сабраныя ў выніку работы студэнтаў і выкладчыкаў, рабіць аналітыку і выпрацоўваць кіраўніцкія рашэнні. Сур'ёзныя напрацоўкі па развіцці лічбавага ўніверсітэта маюць таксама БДУ і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

# ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ — ДА НАС!

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У адрозненне ад іншых падобных творчых спаборніцтваў планка ў яго даволі высокая, бо конкурс разлічаны найперш на тых, хто збіраецца паступаць на журфак. Але і ўзнагароды для пераможцаў і лаўрэатаў вартыя — яны, апроч складання ўласнага партфоліа работ і парад прафесійных журналістаў, ганаровых дыпломаў і памятных сувеніраў атрымліваюць яшчэ і рэкамендацыі ад рэдакцыі для паступлення на журфак. Апошнія даюцца тым з найлепшых, хто ў гэты ж год хоча стаць студэнтам факультэта. Рэкамендацыі даюць пэўную перавагу пры ўсіх іншых роўных шанцах з іншымі абітурыентамі.

Як паказвае шматгадовая практыка, амаль усе пераможцы і лаўрэаты творчага конкурсу «Я малады. І мне не ўсё роўна!» становяцца студэнтамі факультэта журналістыкі. Але не заўсёды, бо некаторыя ў апошні момант выбіраюць іншую спецыяльнасць. Тым не менш не здраджваюць сваёй першапачатковай мары стаць журналістам.

Так, адна з пераможцаў творчага конкурсу, Надзея Бобрык, цяпер з'яўляецца студэнткай другога курса факультэта міжкультурных камунікацый Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. І працягвае дасылаць матэрыялы ў «Чырвонку. Чырвоную змену». У сваёй ВНУ ўвесь вольны час прысвячае журналістыцы: была намеснікам рэдактара студэнцкай газеты, пісала і здымала рэпартажы для афіцыйнага сайта ўніверсітэта. Сёлета пасля першага курса абрала спецыялізацыю «Сувязі з грамадскасцю», яе прызначылі кіраваць журналістамі-студэнтамі прэс-цэнтра МДЛУ. Надзея хоча на чацвёртым курсе прайсці вытворчую практыку ў нас. Гэта цалкам магчыма, і таму ёсць прыклады.

Ангеліна Новікава, таксама пераможца творчага конкурсу аднаго з гадоў, у апошні момант пайшла не на журфак, а паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, цяпер вучыцца на трэцім курсе. Але, як і Надзея Бобрык, не спыняла актыўнага супрацоўніцтва з «Чырвонкай. Чырвонай зменай». І плёнам гэтай работы стала тое, што Ангеліну з 1 лістапада залічылі ў штат. З перспектывамі, як той казаў, кар'ернага росту і магчымасцю працаўладкавання пасля заканчэння вучобы.

Вялікі патэнцыял бачыцца ў Паліне Пракапені — цікаўнай да ўсяго, адказнай і добрасумленнай другакурсніцы журфака. Яна, як і многія іншыя, пачала супрацоўнічаць з маладзёжным дадаткам яшчэ абітурыенткай, перамагла ў творчым конкурсе, паступіла. На першым курсе добраахвотна цягам двух месяцаў праходзіла ў рэдакцыі адмысловую практыку (апроч абавязковай азнаямленчай у раёнцы). Упэўнены, што і наступныя практыкі Паліна будзе праходзіць у «Чырвонцы. Чырвонай змене». А там, глядзіш, і да працаўладкавання адзін крок.

А літаральна днямі ў рэдакцыю з просьбай аб супрацоўніцтве звярнулася цяперашняя першакурсніца журфака, пераможца сёлетняга творчага конкурсу Алена Кухарава. І атрымала ад тых, хто адказвае за выпуск маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена», стандартны ў такіх выпадках адказ: чакаем прапаноў, чакаем ідэй, чакаем матэрыялаў.

Мы заўсёды чакаем найперш ініцыятыўных, здольных нешта прапанаваць. І такія маладыя людзі заўсёды будуць пачуты.

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*У ліку найпершых*

# Раскрыць і падтрымаць таленты

**З новага навучальнага года падрыхтоўка, захоўванне і дастаўка заданняў для трэцяга і заключных этапаў рэспубліканскіх алімпіяд замацаваны за Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Прадугледжаны сканіраванне ўсіх выкананых работ пасля завяршэння кожнага тура і перадача іх ва ўстанову. Пра гэта расказала Анжэла КУДАЯРАВА, кансультант галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі.**



*Фота носіць ілюстрацыйны характар.*

— З'явілася пазіцыя і для вызначэння ўмоў анулявання вынікаў выкананых заданняў. Каб выключыць карупцыйныя моманты, з бягучага года ў складзе журы рэспубліканскіх алімпіяд не будзе педработнікаў, якія займаліся падрыхтоўкай камандаў і ўдзельнікаў, для іх будзе абмежаванне дзейнасці ў складзе журы трыма гадамі, — расказала спікер.

На сённяшні дзень у банк даных таленавітай моладзі ўваходзіць больш за 600 юнакоў і дзяўчат і 208 творчых калектываў. Гэта заначыла **Людміла МАНАКОВА, кансультант упраўлення мастацтваў галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры.**

— Толькі сёлета ён папоўніўся на 124 чалавекі і 11 калектываў. У архіве базы змяшчаецца інфармацыя больш чым пра дзве тысячы чалавек. У банк даных уключаецца інфармацыя пра лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама пра тых, хто з'яўляецца пераможцам і прызёрам міжнародных і рэспубліканскіх мастацкіх і творчых мерапрыемстваў, спаборніцтваў, тэле- і радыёпраектаў.

Лаўрэаты спецыяльнага фонду штогод годна прадстаўляюць краіну на міжнародным узроўні. У якасці прыкладаў — конкурсы «Славянскага базару ў Віцебску», оперных спевакоў «Апералія», маладых піяністаў Grand Piano Competition, акардэаністаў у Літве. «Адзін з яркіх прыкладаў — вядучы саліст Вялікага тэатра Беларусі Павел Пятроў, які пасля трыумфу на конкурсе «Апералія» ў Лісабоне і атрымання прэміі Zarzuela імя Пласіда Дамінга запатрабаваны на прэстыжных оперных пляцоўках свету», — дадала Людміла Манакова.

Падтрымка таленавітай моладзі з'яўляецца асноўным кірункам дзейнасці і для БРСМ, што рэалізуецца праз развіццё маладзёжных ініцыятыў у сферы навуковай, інавацыйнай, прадпрымальніцкай дзейнасці і іншага. Пра гэта расказала **сакратар Саюза моладзі Юлія ЗІНКЕВІЧ:** «У адораных студэнтаў ёсць шмат магчымасцяў, каб праявіць сябе. Напрыклад, ужо 10 снежня чарговы раз абяруць студэнта года. У фінале возьмуць удзел 11 пераможцаў абласных і мінскага гарадскога этапаў. Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала каля 300 юнакоў і дзяўчат. Таксама штогод для актыўнай моладзі праводзяцца інтэлектуальныя турніры, спаборніцтвы па розных відах спорту. Традыцыйна студэнты беларускіх ВНУ бяруць удзел у фестывалі «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», праектах «100 ідэй для Беларусі», «100 ідэй для СНД», дзяўчаты спрабуюць свае здольнасці на конкурсах прыгажосці і грацыі «Каралева вясна», «Каралева студэнцтва».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Далоў стэрэатыпы*

# ПРЫНЯЦЬ СЯБЕ САМОГА

## У гэтым студэнтам дапамагае псіхалагічная служба БДУ



**Сучасны свет часта прымушае людзей надзяваць маскі. Казаць пра свае сапраўдныя пачуцці становіцца сорамна і няёмка, а спроба падзяліцца перажываннямі можа скончыцца абвінавачваннем у «ныцці». Але з праблемамі сутыкаюцца ўсе, і гэта нармальна. Хтосьці не ўпэўнены ў сваіх сілах, а нехта пакутуе ад непаразумення з боку блізкіх... І самае галоўнае ў такіх сітуацыях — прыслухацца да сябе. Калі адчуваеце, што не можаце самастойна справіцца з цяжкасцямі, то не варта саромецца звярнуцца да спецыяліста. Дапамогу студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў вырашэнні гэтых пытанняў аказвае псіхалагічная служба БДУ. Наша суразмоўніца — педагог-псіхолаг Юлія ЯЦКЕВІЧ — выпускніца факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ па спецыяльнасці «псіхалогія, выкладанне псіхалогіі». Скончыла магістратуру таго ж факультэта і вось ужо каля пяці гадоў дапамагае студэнтам спраўляцца са складанымі жыццёвымі сітуацыямі.**

— Псіхалагічная служба БДУ — шырокае поле для дзейнасці псіхолага, — кажа спецыяліст. — Тут я магу выкарыстоўваць розныя метадыкі ў рабоце, бо з'яўляюся таксама і сертыфікаваным арт-тэрапеўтам. Арт-тэрапія (ад англійскага art — «мастацтва» + тэрапія) — кірунак у псіхатэрапіі і псіхалагічнай карэкцыі, ён заснаваны на выкарыстанні для тэрапіі мастацтва і творчасці.

У сценах універсітэта арганізоўваюцца розныя фэсты, групавыя сустрэчы. Ёсць такая практыка: студэнты навучальных груп могуць заказваць трэнінг на пэўную тэму — матывацыя, работа з пракрастынацыяй (адкладванне заданняў і абавязкаў на потым), тайм-менеджмент (эфектыўнае планаванне рабочага часу).

— У апошнія гады радуе тэндэнцыя знікнення стыгматызацыі вакол тых, хто звяртаецца да псіхолагаў. Прыходзячы на групавыя занятсі, студэнты да мяне ўсё часцей звяртаюцца ў прысутнасці сваіх аднагрупнікаў. Цікавяцца, як можна запісацца на прыём. Так што работы ў псіхолагаў цяпер даволі шмат, і па розных кірунках, — расказвае Юлія.

Паслугі абсалютна бясплатныя і канфідэнцыяльныя. Студэнт можа прыйсці з любой праблемай, і яна не выйдзе за межы кабінета, калі гэта не пагражае жыццю кліента або навакольным. Але важна разумець, што псіхалагічная служба БДУ — гэта ўсё ж такі кансультаванне, а не тэрапія, вырашэнне канкрэтнай праблемы за кароткі прамежак часу. А тэрапія — гэта працяглы і працаёмкі працэс, калі праблема сур'ёзная і знаходзіцца глыбока ўнутры.

Для вырашэння пэўнай задачы звычайна хапае 5-10 сустрэч, максімум 15. Але калі студэнт, які звярнуўся, не адчувае прагрэсу, то гэта падстава звярнуцца да псіхатэрапеўта. Псіхалагічная служба БДУ цесна супрацоўнічае з 33-й студэнцкай палiклінікай, дзе аказваецца такая дапамога. Лячэнне прызначаецца як медыкаментознае, так і без фармакалагічных сродкаў. У залежнасці ад глыбіні праблемы тэрапія можа доўжыцца ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў.

— Работа са студэнтамі часцей за ўсё звязана з тэмай прыняцця сябе. Вакол сучаснага чалавека існуе велізарнае інфармацыйнае поле. Калі знаходзішся ў ім беспярапынна, унутраны перфекцыянізм перарастае ў жаданне стварыць з сябе ідэальны вобраз. Вельмі часта да нас прыходзяць дзяўчаты з расстройствамі харчовых паводзін, такімі як анарэксія, булімія. Іншыя звяртаюцца з праблемамі, звязанымі з асабістымі адносінамі: з бацькамі, з аднагодкамі, з каханым. Многія прыходзяць са скаргамі на адсутнасць матывацыі або нерэалізаваныя амбіцыі, — працягвае педагог-псіхолаг.

— На паліцах кніжных крам у апошнія гады з'явілася вельмі шмат псіхалагічнай літаратуры накшталт «Мастацтва пафігізму», «Мастацтва дамінаваць», «Як стаць паспяховым». Ці можна давяраць ёй?

— Спадзяваюся на тое, што, прачытаўшы кнігу «Як стаць паспяховым», вы адразу паднімецеся па кар'ернай лесвіцы і пачняце зарабляць мільёны, — дакладна не варта. Аднак можна смела займаць пазіцыю даследчыка і аналізаваць, наколькі дапамагаюць або не дапамагаюць гэтыя кнігі ў той час, калі вы займаецеся рэальнай дзейнасцю, працуеце над сабой. Пакуль не пачняце дзейнічаць, ніякая літаратура не дапаможа, — даводзіць суразмоўніца. — Я часта чую фразу «Нiколі не позна падарыць сабе шчаслівае дзяцінства». І сапраўды, з дапамогай тэрапіі можна справіцца з траўмамі, атрыманымі ў дзяцінстве, пакінуць у мінулым многія непрыемныя падзеі і жыць далей.

**Кнігі, якія Юлія параіла для чытання:**

1. «Рэцэпт шчасця. Прымайце сябе тры разы на дзень». Аўтар — Кацярына Сігітава.
2. «Парадак нараджэння». Аўтар — Альфрэд Адлер.
3. Серыя «Слухай сваё цела». «Пяць траўмаў, якія перашкаджаюць быць самім сабой». Аўтар — Ліз Бурбо.
4. «Варажба па рэальнасці. Азбука арт-тэрапіі». Аўтар — Ганна Яфімкіна.
5. «Інтуітыўнае харчаванне». Аўтар — Святлана Бронніква.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# Калі на душы рай, інтэрнатам не пужай

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Не зважаючы на сімпатыю, першыя паўгода яны нават і не думалі пра рамантычныя стасункі, толькі сябравалі. Але калі лепш даведаліся адно пра аднаго, зразумелі, што пасобку ўжо не могуць.

— Маша тады ўжо вучылася ў Мінску, таму я прыязджаў да яе як мага часцей, — кажа Сяргей. — Хацелася быць заўсёды побач, але калі ты знаходзішся на адлегласці 350 кіламетраў, зрабіць гэта няпроста.

— Затое цяпер амаль кожны дзень разам, і гэта прыемна, — дадае жонка. — Бывае, што сустракаемся з сябрамі, але насамрэч мы вельмі дамашнія: калі-некалі выйдзем увечары ў парк або пасядзім у кавярні.

**«Мы ж нездарма праграмісты. Усё падлічваем, але толькі для таго, каб рацыянальна размеркаваць пакупкі».**

Маша прызнаецца, што пасля трох з паловай гадоў стасункаў з Сяргеем думкі пра замужжа закрадваліся ўсё часцей, але хлопцу яна іх не агучвала. Аднак таму і не трэба было: ён зрабіў сюрпрыз каханай летась у лютым, а вяселле прайшло ў ліпені.

— У нас не было жадання арганізаваць свята, каб хтосьці яго ацаніў. Мы хацелі ўрачыстасць менавіта для нас дваіх. Гасцей не было, некаторыя сваякі нават не ведалі пра гэтую падзею.

Маша ў IT-сферы толькі год, да таго закончыла Лінгвістычны ўніверсітэт, але пасля захацела паспрабаваць нешта зусім іншае. Пра такі выбар не шкадуе, бо лічыць, што веды, якія яна атрымала раней, вельмі патрэбныя для развіцця ў новым кірунку.

— Спачатку для мяне гэта было штосьці незразумелае, незвычайнае. Але з дапамогай Сяргея навучанне пайшло лягчэй. Цяпер я ўжо добра арыентуюся ў будучай прафесіі. Размеркаванне чакае нас абодвух. Мы рыхтуемся да яго, шукаем месцы ў розных кампаніях. Дакладна ведаем, што застанемся ў Мінску, бо тут перспектыў больш. Адным словам, яно нас не пужае, — усміхаецца суразмоўніца.

Дарэчы, Сяргей закончыў школу з залатым медалём, ды і цяпер вучыцца на «выдатна».

— Мяне да гэтага ніхто не прымушае. Выкладчыкі ставяцца да нас з павагай, даюць веды, якія дакладна спатрэбяцца ў будучыні. На сённяшні дзень мая мэта — трапіць у Парк высокіх тэхналогій або зарэкамендаваць сябе ў паспяховай IT-кампаніі.

...У пакоі маладой пары вельмі ўтульна, шмат сумесных фотаздымкаў, распісных карцін і прыгожа расстаўленых ручных вырабаў...

— Гэта ўсё мая Марыйка, яна любіць ствараць нешта цікавае, а таксама фатаграфавацца. Шчыра кажучы, я не аматар, аднак дзеля яе гатовы пацярпець, — усміхаецца Сяргей. — Увогуле мы імкнёмся адно аднаму дапамагаць у хатніх справах, абавязкі дзелім пароўну. Разам гатуем, хоць рабіць гэта ў інтэрнаце не вельмі зручна, бо тут маленькая кухня. Спадзяюся, што калі ў нас з'явіцца асобнае жыллё, Маша будзе радаваць мяне кожны дзень новай стравай, — паглядаючы на жонку, ці то жартам, ці то ўсур'ёз, кажа хлопец.

Жыць у інтэрнаце студэнцкай сям'і падабаецца. Ёсць усё неабходнае, ды і плацяць за яго нашмат менш, чым і цяпер каштуюць арэндныя кватэры. Канавалавы кажуць, што бюджэт у іх агульны, але кожны мае свае грошы на невялікія расходы.

**«Мы імкнёмся адно аднаму дапамагаць у хатніх справах, абавязкі дзелім пароўну».**

— Мы ж нездарма праграмісты. Усё падлічваем, але толькі для таго, каб рацыянальна размеркаваць пакупкі. Стыпендыя ў нас амаль аднолькавая. Дапамагае тое, што мы не вельмі любім шопінг, абнаўляем гардэроб толькі па неабходнасці, — расказвае хлопец і дадае: — Калі я жыў у інтэрнаце адзін, жыццё было звычайнае, размеранае. А калі з'явілася Маша, зразумела, пачаліся і пэўныя абавязкі. Але мяне гэта не напружвае, так нават цікавей.



— Пяць гадоў да замужжа я жыла ў цёткі і хатнімі клопатамі не была абцяжараная. А цяпер усё гэта давялося адчуць на сабе. Напрыклад, раней не ўмела варыць супы, але цяпер, здаецца, атрымліваецца, — прызнаецца дзяўчына.

— Яны вельмі смачныя! — пацвярджае словы жонкі Сяргей. — Пакаштаваць сёння не зможаце, але паверце на слова.

Пара лічыць, што для захавання гармоніі ў стасунках трэба проста кахаць адно аднаго і не даваць нагоды для рэўнасці. Сужэнцы таксама ўпэўненыя, што невялікая розніца ва ўзросце — не перашкода для стварэння сям'і.

— Мая цётка старэйшая за свайго мужа, — кажа Сяргей.

— А ў мяне мама — за тату, — працягвае Маша. — І я старэйшая за Сярожу на тры гады, не бачу ў гэтым праблемы.

— Характары ў нас розныя: я больш рацыянальна да ўсяго падыходжу, — прызнаецца хлопец, — а Маша рамантычная натура. Ёй падабаюцца сюрпрызы і мілыя падарункі.

— У вас ёсць сумесная мара на найбліжэйшую будучыню?

— Так выйшла, што мы дагэтуль не з'ездзілі ў вясельнае падарожжа. Не хапала часу, ды і студэнтам нялёгка накапіць на добры адпачынак. Муж вельмі хоча пабачыць цуды свету, а мне не прынцыпова: люблю проста знаёміцца з культурамі розных краін, любавацца архітэктурай. Хоць не, ёсць асаблівае места для мяне — гатычны сабор у Кёльне. Ён проста зачароўвае! — шчыра апавядае Маша і моцна трымае за руку свайго Сярожу...

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Свой стыль*

# «КАРАТЭ — ГЭТА ШЛЯХ ДАЎЖЫНЁЙ У ЖЫЦЦЁ»

**Сваю дзейнасць старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, трэнер зборнай каманды БДУ, прадстаўнік Сусветнай федэрацыі Сітару каратэ, уладальніца чацвёртага дана Кацярына ЛЫСЕНКА пачала 18 гадоў таму, першакурсніцай універсітэта фізічнай культуры. А пазнаёмілася з адзінаборствам у дзяцінстве: тады побач са школай у родным Бабруйску знаходзілася секцыя па гэтым відзе спорту. Ужо адзінаццаць гадоў яна працуе з некалькімі групамі: спартыўнага ўдасканалення, дзе займаецца каля двух дзясяткаў студэнтаў, і са зборнай БДУ, што складаецца з шасці чалавек, сярод якіх ёсць і члены нацыянальнай зборнай.**



Першакурсніца Марыя Ляшкова адпрацоўвае ката.



Яўгенія Нікалаева з трэнерам *(крайняя злева).*

— Розніца паміж імі — у валоданні майстэрствам адзінаборства, а таксама ў гадзінах, адведзеных на трэніроўкі. Напрыклад, майстры спорту, члены нацыянальнай зборнай наведваюць секцыю кожны дзень, а іншыя — некалькі разоў на тыдзень. Упэўнена, што дзеці ідуць за трэнерам. Са мной яны пачалі займацца гэтым відам спорту, яшчэ калі былі маленькія. Тых, хто прыходзіць «з нуля», няшмат. Цікава, што яшчэ пяць гадоў таму была ўстойлівая цікавасць да гэтага віду спорту найперш хлопцаў, а цяпер юнакоў і дзяўчат — пароўну, — заначыла трэнер.

Каратэ займаюцца для развіцця свайго цела, умацавання духу, для самаабароны ці для таго, каб пазбавіцца пэўных комплексаў. Уладальнікі чорных паясоў **васемнаццацігадовая Марыя ЛЯШКОВА, якая вучыцца на факультэце сацыякультурных камунікацый БДУ, і сямнаццацігадовая студэнтка Інстытута бізнесу той жа ВНУ Яўгенія НІКАЛАЕВА** аддалі перавагу каратэ яшчэ адзінаццаць гадоў таму.

— Мне падабаецца, што адзінаборства развівае каардынацыю, дае нагрузку на ўсе групы цягліц. Яно падобнае на медытацыю: падчас выступленняў мы канцэнтруемся не на гледачах, а на асабістых пачуццях. Хутка зразумела, што хачу займацца гэтым спортам прафесійна. У 2017 годзе разам з камандай мы ездзілі на чэмпіянат свету ў іспанскі Тэнэрыф, там занялі сёмае месца. Сёлета — на чэмпіянат свету ў Токіа, дзе ўзялі бронзавы медаль. Былі і на прэм'ер-лігах у Сафіі, Маскве, Стамбуле... З апошняга — удзел у Рэспубліканскай універсіядзе, якая адбылася ў лістападзе. Вынік — залаты медаль у раздзеле «жаночае каманднае ката» (ката — паслядоўныя рухі, звязаныя прынцыпамі вядзення паядынку з сапернікам ці іх групай). А Жэня там стала першай у раздзеле «асабістае ката», а таксама ў кумітэ (усе разнавіднасці бою падчас паядынку). Калі шчыра, я не ўспрымаю перамогу як галоўную мэту, мне важней удасканальваць сваё майстэрства, абмяркоўваць моцныя і слабыя бакі выступленняў, выконваць работу над памылкамі, — дзеліцца Маша.

— Сумненняў, што хачу займацца менавіта гэтым відам спорту, не было, — працягвае Жэня. — З першых заняткаў спадабаўся дух, які пануе падчас трэніровак, эстэтыка рухаў, самі спаборніцтвы. Трэніроўкі, якія праходзяць у нас амаль кожны дзень, робяць мяне больш дысцыплінаванай і адказнай, я сапраўды атрымліваю асалоду ад працэсу.

Не трэба быць ваяўнічымі, каб быць моцнымі. Бо гэта парушае гармонію прыроды. А яшчэ не нападаць, а ўдала абараняцца, абыходзіцца без агрэсіі. У гэтым заключаецца галоўная філасофія каратэ.

— Любая задача па развіцці сябе як асобы можа быць рэалізавана з дапамогай адзінаборства. Мая задача як трэнера — паказаць шматграннасць таго, чым займаемся. Калі мы ездзілі на чэмпіянат свету ў Японію, назіралі за выступленнямі спартсменаў, якім было за 70 гадоў. Дзядулі і бабулі былі захоплены каратэ амаль усё жыццё, і гэта прыемна ўражвала. Каб у маіх навучэнцаў быў добры прыклад перад вачамі, я таксама выступаю з імі на спаборніцтвах. Калі да іх рыхтуемся, прапрацоўваем розныя тэхнікі, пры гэтым заданні для кожнага індывідуальныя. Перыядычна змяняем падыходы да трэніровак, напрыклад займаемся на прыродзе — там лепш адчуваецца свабодны дух адзінаборства, — расказвае Кацярына.

Амаль усе героі нашага аповеду маюць чорныя паясы, што паказвае іх высокае майстэрства.

— Упэўнена, што працавітасць заўсёды перамагае талент, — дадае суразмоўніца. — Студэнты, якія ўваходзяць у зборную ВНУ па каратэ, прысвяцілі адзінаборству не адзін год, таму і маюць званне майстроў спорту. Яны пацвердзілі свой прафесіяналізм, здаючы экзамен у Японіі, а гэта вельмі прэстыжна.

| **15** | Машина д/изм. фруктов (инв. № 2326), 2009 г. в. | **90,00** | 9,00 |
| **16** | Машина д/выж. сока нерж. 20 л. (инв. № 2325), 2009 г. в. | **318,00** | 31,80 |
| **17** | Прицеп тракторный 2 ПТС 6.5, зав. № 0119, рег. № МЖ 6363, 2009 года выпуска, состояние – технически неисправен | **360,00** | 36,00 |

**Продавец:** ОАО «Лоевский комбинат бытового обслуживания», Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 690-00-10 – председатель ликвидационной комиссии Беланов Руслан Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Лоевский комбинат бытового обслуживания»):** р/с BY66 BAPB 3012 4367 5001 3000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНН 400028996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 декабря 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 18 декабря 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **3 (три) дня** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.07.2019 г. № 141 (29008). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

SEX-БАЛЯСЫ

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫБАРУ

**Нядаўна часопіс People прысвоіў спеваку Джону Леджэнду званне «самага сексуальнага з цяперашніх мужчын». Ні больш ні менш. Чулі пра гэта? Той заявіў выданню, што навіна «адначасова хвалюе і палохае» яго. Ну яшчэ б! («87 працэнтаў людзей спецыяльна пішуць слова «шалаш» задам наперад».) Можа, вы ведаеце названую асобу не пад псеўданімам, а пад сапраўдным імем — Джон Роджэр Стывенс? («— Ты разбіраешся ў паэзіі Сярэбранага веку? — Канешне! — І Ахматаву ад Севераніна адрозніш? — Ды лёгка! Паказвай фоткі...») Не, не тое каб я вельмі так ужо зайздросціў прысвоенаму тытулу, проста асабіста для мяне ўся згаданая інфармацыя — міма. Можа, знаўцам дапамогуць дадатковыя звесткі: гаворка ідзе пра 40-гадовага спевака, акцёра, аўтара песень, уладальніка прэмій «Грэмі», «Оскар», «Залаты глобус» і «Эмі»? Мне зноў жа, прабачце, не.**



Я ўпэўнены, што гэта неблагі і, вядома ж, таленавіты чалавек, проста я яго не ведаю. Як не ведаю, з кім ён спаборнічаў. Таму асабіста мяне і здзіўляе такое гучнае званне. («Падчас сексу з мужам уявіла Джоні Дэпа. Ну што магу сказаць... Ад каго-каго, а ад Джоні я чакала большага...») Гэта прыкладна тое ж самае, калі чуеш ці чытаеш пра «зорку» нейкіх там серыялаў і думаеш пра сябе: хто ты? Хто табе даў гэта «званне»? Ну, вышэйназваную сітуацыю ўраўнаважвае адзін нюанс — тытул прысвоены па версіі часопіса. («— Вікенцій, а як вы даведаліся, што вы — мача? — Мама сказала...») Гэта калі не цалкам апраўдвае выбар, дык прынамсі здымае некаторыя пытанні.

Той жа часопіс People крыху раней назваў самай прыгожай жанчынай свету 47-гадовую Джэніфер Гарнер, маці трох дзяцей, ранейшую жонку Бена Алфека (яго я хоць ведаю). Зноў жа — мне не шкада! Тым больш, паводле слоў актрысы, яна сама здзівілася свайму новаму статусу. («— Ёсць такая прафесія ў жанчын — архітэктар-афтальмолаг... — Ніколі не чуў. Што ж яны робяць? — Вочкі строяць...») А «жывая Барбі» Нанет Хамонд з ЗША летась трапіла на вокладку славацкай версіі Playboy як... «Дзяўчына года». Жанчыне 45 гадоў, яна маці шасці (!) дзяцей. («Добра быць жанчынай гадоў трыццаці... Можаш сустрэць мужчыну гадоў на дзесяць старэйшага ці на дзесяць гадоў маладзейшага... Які дыяпазон, якія перспектывы... Дваццацігадовым дзяўчатам палова опцый недаступная».) Яшчэ «Барбі» вядомая тым, што патраціла амаль паўмільёна долараў на пластычныя аперацыі, каб быць падобнай на славутую лялькУ. Нанет тройчы павялічвала грудзі, рабіла пластыку твару і іншых частак цела. («Кажуць, што ўрачоў не трэба саромецца. Яны, маўляў, бясполыя... Проста гэтыя людзі не бачылі нашу дантыстку з пятым памерам бюста. Нахіляючыся над пацыентам, яна нават не просіць яго раскрыць рот».)

Хоць бывае і зусім процілеглы выбар. Ужо расійская «Барбі» Валерыя Лук'янава, якая таксама патраціла велізарныя грошы на пластыку дзеля падабенства з амерыканскай лялькай (каб павялічыць вочы да патрэбных памераў, нават выкарыстоўвала спецыяльныя кантактныя лінзы і ўнікальную тэхніку нанясення макіяжу), вырашыла развітацца з гэтым вобразам. («Знайшла ў інтэрнэце параметры ідэальнай фігуры. Абмерала сябе. Выявіла ў іх некалькі сур'ёзных памылак...») Цяпер яна выглядае як зусім звычайная дзяўчына. («Выпраўленаму верыць. Касметолаг».)

А напрыклад, амерыканскі кватэрбек «Караліны Пэнтэрс» Кэм Н'ютан вырашыў напярэдадні сёлетняга сезона Нацыянальнай футбольнай лігі на месяц адмовіцца ад сексу і перайсці на веганскую дыету. Усё дзеля паспяховага выступлення. Адмова ад мяса, на думку спартсмена, павінна была станоўча адбіцца на стане яго арганізма. («— Я веган! — Ды ў цябе проста добрага шашлыку не было!») Ну ладна, з тым мясам... 29-гадовы футбаліст вырашыў, што месячнае ўстрыманне дазволіць яму захаваць ментальную сілу. А дзяўчына ў амерыканца, між іншым — мадэль і ранейшая стрыптызёрка Шакія Проктар, дарэчы, пара выхоўвае траіх дзяцей. Во сіла волі! («— Мілы, ведаеш, што я зараз раблю? Смажу бульбу, і на мне амаль што нічога няма. — Так, тэрмінова выязджаю! — Пазабаўляемся? — Ты там глядзі, не жэры ўсё!») Не ведаеце, чым усё скончылася? Неяк страшнавата самому прабіваць інфармацыю... («Як гавораць беларусы, у запрашэнні на дранікі адчуваецца нейкі сексуальны падтэкст...»)

Не заўсёды выбар залежыць ад нас саміх. Кароль Тайланда, ледзь паспеўшы ажаніцца ў ліпені, ужо пазбавіў сваю чацвёртую абранніцу — прафесійную вайсковую лётчыцу, генерал-маёра, медсястру і целаахоўніцу — усіх яе афіцыйных званняў і тытулаў, асаблівага статусу. Памятаеце, як у вядомай песні з «Вялікай перамены»: «Мы выбіраем, нас выбіраюць, як гэта часта не супадае...»? Як паведамляецца, за вераломства — яна быццам спрабавала ўзвысіцца да каралевы. («Як гаварыла адна ідэальная баба... Ды ніяк яна не гаварыла... Нямая была».)

Так што з выбарам лепш быць асцярожнымі. Ці мала што? («У агенцтве: — Хачу зняць кватэру з маладым чалавекам. У цэнтры. Цана — па дамоўленасці. З мэбляй і бытавой тэхнікай. — Маладых чалавек ваш ці наш?»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# ПРЫЦЯГНЕННЕ «МАЛАДОСЦІ»,

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Што да новага «прамоўшана»...***

— Што да яго, то ў канцэпцыю «Больш чым часопіс» уваходзяць дзве маштабныя акцыі, цесна сплеценыя адна з адной і ў той жа час незалежныя. Гэта цыкл рэдакцыйных лекцый «МаладосТЕАМ на ўвесь свет», з якім мы заяўляемся ва ўніверсітэты і які ўключае тэмы, актуальныя для будучых лінгвістаў, філолагаў, журналістаў, выдаўцоў і проста творчай моладзі. Гэта лекцыі і пра літаратуру, і пра журналістыку, і пра «Маладосць». Другі складнік канцэпцыі — анкетаванне, якое праводзіцца падчас лекцый або можа быць здзейснена на інтэрнэт-старонцы нашага выдання. Яно мае падвойную мэту: нам яго вынікі дапамогуць яшчэ выразней бачыць сваю аўдыторыю, а моладзь атрымае магчымасць больш ведаць пра наш часопіс і перспектывы супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Пазнака на анкеце — пра магчымасці, якія выданне гатова даць тым, «каму ёсць што сказаць свету», — гэта не проста слоган. Мы прапануем маладым людзям быць сутваральнікамі часопіса. Ад гэтага і пытанні адмысловага кшталту, і неардынарныя прапановы: «Уяві, што табе трэба прадаць рубрыку», «Уяві сябе галоўрэдам»...

**«Літаратура — гэта не проста збег думак, ідэй і натхнення, што гэта не толькі творчы палёт, але і пакуты — сумненні, стараннe, пошук, што талент трэба не толькі праяўляць, але і выхоўваць».**

***— Вы нават прапануеце вылучаць кандыдатаў на «нобелеўку»...***

— Ну, так *(з усмешкай)*. У процівагу выразу «Нічога асабістага» тут трэба сказаць: «Толькі асабістае». У рубрыку «Мой набеліст» кожнаму патэнцыйнаму яе аўтару прапануецца напісаць пра пісьменніка, якога асабіста ён, гэты аўтар, узнагародзіў бы ўласнай Нобелеўкай, з абгрунтаваннем: за што. Гэта павінна быць асабістая аргументацыя на карысць творцы, які на пэўным этапе жыцця аўтара моцна на яго паўплываў. Пісьменнік можа быць з любой краіны і любой эпохі і нават малавядомы і малапрызнаны. Тут дзейнічае прынцып «не для ўсяго свету, але для мяне асабіста». Рубрыка мае некалькі мэт, і прапаганда твора, узмацненне цікавасці да пісьменніка — першая, але не самая важная. А мо і наогул не мэта на фоне наступнага: важна паведаміць маладым чытачам, якія па большасці адначасова і самі літаратары, па-першае, наколькі гэта адказна — пісаць, ведаючы, што цябе прачытаюць, а па-другое, наколькі індывідуальнасць мацнейшая, чым мода, масы, брэнды і трэнды. Бо ўсё апошняе пералічанае ствараецца першым.




***— Ваша рубрыка «100slow» — такая нібы серыя самапрэзентацый маладых аўтараў...***

— Так і задумвалася, але больш не для саміх гэтых аўтараў, а для тых, хто яшчэ толькі наважваецца да іх далучыцца. Гэта літаральна 100 слоў, якія прапануецца напісаць нашым творцам пра тое, як яны дайшлі да выдання. Але звярніце ўвагу на slow — «павольны». Ідэя ў тым, што «Маладосць» працягвае заставацца часопісам, трапіць у які са сваім напісаным — нешта ды значыць. Яго роля для маладых заключаецца сярод іншага і ў тым, каб даць зразумець, што літаратура — гэта не проста збег думак, ідэй і натхнення, што гэта не толькі творчы палёт, але і пакуты — сумненні, стараннe, пошук, што талент трэба не толькі праяўляць, але і выхоўваць. «Маладосць» — не зборнік твораў, безагляднa прынятых да друку, хутчэй гэта зборнік набела перапісаных чарнавічкоў, над якімі аўтар працаваў упарта і часам доўга, пад наглядам рэдактараў. І ў тых слёзы шчасця навароч ваюцца на вочы, калі ў «100slow» прысылаецца, скажам... А вось я вам некаторае прачытаю:

**«У рубрыку «Мой набеліст» кожнаму патэнцыйнаму яе аўтару прапануецца напісаць пра пісьменніка, якога асабіста ён, гэты аўтар, узнагародзіў бы ўласнай «нобелеўкай», з абгрунтаваннем: за што».**

*«Не адмялі, не пасмяяліся. Тэксты ўзялі, удумліва прачыталі, патлумачылі, дзе памылкі. Слоўнікі параілі, рэсурсы і даведнікі. Пахвалілі, падтрымалі, у друк адправілі. І вырасла дзяўчынка за тры гады ў паспяховую, запатрабаваную аўтарку. Вось што такое для мяне «Маладосць».*

*«Першае эсэ для «Маладосці» я напісала недзе каля свайго 18-годдзя — часу сама- (-капання, -пошуку, -бічавання, -аналізу). Хацелася зразумець, хто я, але атрымлівалася так-сяк-накасяк, абы не па-людску. З кожным новым тэкстам, выплюхваючы страхі, спадзяванні, мары, уласцівыя юнацтву, я сталела ў «Маладосці», і, вельмі спадзяюся, хто-небудзь з аднагодкаў разам са мной. З часопісам я дзялілася вандроўкамі, сустрэчамі, жыццём у інтэрнаце, думкамі пра лёс»,*

**«Мы прапануем маладым людзям быць сутваральнікамі часопіса. Ад гэтага і пытанні адмысловага кшталту, і неардынарныя прапановы: «Уяві, што табе трэба прадаць рубрыку», «Уяві сябе галоўрэдам»...**

*«Толькі ўявіце: вашы творы чытаюць. Падпраўляюць. Друкуюць (ага, нават на паперы!). А ў паштовую скрыню ляцяць зваротныя «маладосцеўскія» лісты з прапановай наведаць імпрэзу, напісаць у рубрыку. Дасылаць штосьці навенькае. Тры гады мінула, а я ўсё дзіўлюся. Дзіўлюся — але дасылаю. Паспрабуйце і вы».*

*«Быкаў тынкаваў будынкі, навучаючыся ў ФЗА, Даўлатаў будаваў метро ў Ленінградзе, Стэйнбек прарабкаваў, а Букоўскі, здаецца, нагул усім займаўся. Так-так, я відавочна лісліўлю сабе, калі перабіраў усе гэтыя імёны, адной рукой гартаючы паведамленне ад рэдакцыі, што тэкст прыняты, а другой тынкуючы сценку. Чарговая, трыццаць восьмая, спроба завязаць нешта пісаць адкладаецца. Праўда, бралі мяне псіхі яшчэ разоў восем да тых трыццаці васьмі, але нічога, нармальна. Будзем, значыць, працаваць і развівацца разам, калі ўжо давярылі!»*

Вось такія водгукі аўтараў на работу з імі, а галоўнае — на іх работу над сабой і сваімі творамі. І гэта таксама да тэмы «Больш чым часопіс», таму што гарэць ідэямі — гэта вельмі мала, і запальваць іншых — таксама тольккі палова справы. Трэба неяк так пастарацца, каб агонь, запалены ў іншых, не згасаў. Вось да гэтага мы імкнёмся. А як будзе — пакажа час...

**Гутарыў Аляксей ЗБАРСКІ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 4.12.2019 г.

Яшчэ не вечар!

# РАЗВІТАЦЦА З РАКАМ І ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ

## Як у Беларусі рэабілітуюць анкахворых

**Паведамленне анкалагічнага дыягназу ў любога чалавека выклікае псіхалагічны крызіс, і каб пераадолець яго, трэба ад некалькіх месяцаў да 1,5 года. Як псіхолагі і псіхатэрапеўты анкадыспансераў вучаць з ім спраўляцца, якія ўскладненні ўзнікаюць пасля аперацый, прамянёвай і хіміятэрапіі, дзе анкахворыя могуць прайсці рэабілітацыю і каму яна паказана, а таксама што самае цяжкае ў жыцці пасля таго, як лячэнне скончана, расказалі ўрачы-анколагі, псіхатэрапеўты і рэабілітолагі.**

### Псіхалагічны крызіс у дадатак да дыягназу

— Анкалагічнае захворванне заўсёды прыходзіць знянацку, і чалавек страчвае кантроль над сваім жыццём. Ён існуе з адчуваннем нявызначанасці, звыклая карціна свету цалкам разбураецца. Надыходзіць псіхалагічны крызіс, які адчуваецца як абсалютная бязвыхаднасць, бездапаможнасць, — расказвае **загадчык медыка-псіхалагічнага аддзялення РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Александрава Эвеліна СІНКЯВІЧУТЭ.** — Справа ў тым, што з псіхалагічнымі крызісамі кожны чалавек сутыкаецца пастаянна на працягу жыцця. Але калі размова ідзе пра маштабную падзею, напрыклад цяжкае захворванне, то запускаюцца доўгія механізмы адаптацыі — ад двух-трох месяцаў да 1,5 года. Нельга сказаць, што псіхалагічны крызіс — гэта адназначна дрэнна, ён неабходны, каб чалавек выпрацаваў іншыя навыкі ў новай жыццёвай сітуацыі. Сутыкаючыся з любой цяжкасцю, мы імкнёмся неяк з ёй справіцца. З анкалагічным дыягназам таксама неабходна справіцца. Мы вучым гэтаму пацыентаў.

**«Таму хацелася б, каб у нас было больш рэабілітацыйных цэнтраў, бо нашым пацыентам патрэбны дапамога і падтрымка».**

Трэба адзначыць, што ў РНПЦ анкалогіі псіхалагічную дапамогу хворым прапануюць на кожным этапе: як падчас абследавання і лячэння, так і пасля. І калі пацыент пагаджаецца, з ім працуюць спецыялісты. У клініцы псіхалагічны крызіс выяўляюць пры дапамозе «тэрмометра дыстрэсу». Гэта суб'ектыўная ацэнка пацыентам узроўню свайго стрэсу ў дадзены момант і вызначэнне сфер жыцця, якія ўплываюць на такое адчуванне. Такі скрынінг на наяўнасць дыстрэсу важны як для пацыента, так і для псіхолага, псіхатэрапеўта, і для ўрача-анколага. Ён дапамагае сфарміраваць індывідуальны падыход да пацыента і максімальна паўплываць на якасць яго жыцця ў лепшы бок.

Праводзіцца ў клініцы і сямейнае кансультаванне, псіхалагічная дапамога аказваецца сваякам хворага.

— Якасць жыцця аднаго чалавека ўплывае на жыццё іншых членаў сям'і. І калі хварэе нехта адзін, разам з ім пакутуюць усе, бо ў такой сітуацыі немагчыма заставацца раўнадушным і абыякавым, — кажа Эвеліна Сінкявічутэ. — Усім вядомы этапы перажывання гора: спачатку стадыя адмаўлення і шоку, затым агрэсіі, торгу, дэпрэсіі і апошняя стадыя — прыняцця. Члены сям'і, блізкія перажываюць усе гэтыя этапы, але не заўсёды яны супадаюць у розных людзей. Таму псіхалагічная дапамога неабходна блізкім, сваякам, сужыцелям.

Але галоўнае, што павінны памятаць і хворыя, і іх блізкія, — для сучаснай медыцыны многія анкалагічныя дыягназы — не прыгавор.

— Паведамленне анкалагічнага дыягназу нярэдка ўключае ў свядомасці чалавека такую тоеснасць — «Рак = смерць». Справа ў тым, што ў рэальнасці гэта не так. Медыцына рухаецца наперад у лячэнні анкалагічных захворванняў, а падсвядомасць пацыента сфарміравана 20-30 гадоў таму, калі на працягу жыцця назапашваліся нейкія веды. Малая інфармаванасць у пытаннях лячэння анкалогіі вядзе да таго, што ў няведданні чалавек выстройвае пэўныя страшныя ілюзіі. І пры такім мысліцельным працэсе, безумоўна, непазбежны моцны псіхалагічны крызіс, — тлумачыць Эвеліна Сінкявічутэ.



Ірына ЖЫХАР перажыла тры анказахворванні.

Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.

### Прадухіліць ускладненні

Паралельна з работай з псіхолагамі пацыент павінен праходзіць і рэабілітацыю. Яна пачынаецца адразу пасля хірургічных аперацый і звычайна праводзіцца ў анкалагічных стацыянарах.

— Рэабілітацыйныя цэнтры бяруць звычайна пацыентаў 3-й клінічнай групы — да яе адносяцца тыя, хто скончыў лячэнне і з'яўляецца практычна здаровым. А гэтаму папярэднічае доўгі час: хірургічная аперацыя, правядзенне 6-8 курсаў хіміятэрапіі з 21-дзённымі перапынкамі, прамянёвая тэрапія на працягу месяца. Усё займае да 8-9 месяцаў, — расказвае **ўрач-анколаг кансультацыйна-палікінічнага аддзялення РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Валянціна СУРАВІКІНА.** — Пацыентаў з пасляаперацыйнымі, хіміятэрапеўтычнымі, прамянёвымі ўскладненнямі рэабілітацыйныя цэнтры не бяруць. Што рабіць такім хворым? На базе нашага цэнтра няма рэабілітацыйнага аддзялення. Гэты клопат кладзецца на фізіятэрапеўтычны кабінет. У штаце ўсяго адзін урач-фізіятэрапеўт, дзве медсястры, тры інструктары-метадысты па ЛФК і масажыст. Вельмі малыя сілы, якія ажыццяўляюць вялікі аб'ём работы. За 10 месяцаў гэтага года праз яго прайшло 1050 першасных пацыентаў і ў 5-6 разоў больш паўторных, якія звяртаюцца як амбулаторна, так і ў стацыянары.

Рэабілітацыю пажадана пачынаць ужо на другі дзень пасля аперацыі. Гэта лячэбная фізкультура ў ашчадным рэжыме, а таксама масаж, неабходны, каб зняць ацёк пасляаперацыйных тканак і прадухіліць развіццё кантрактур і лімфедэм. Праз невялікі прамежак часу выконваецца лакальная магнітатэрапія, каб зняць запаленне і ацёк.

— Ёсць цяжкія пацыенты, асабліва ў аддзяленнях вертэбралогіі і нейрахірургіі. Самыя цяжкія, на мой погляд, хворыя з пухлінамі галавы і шыі: ім выконваюцца аперацыі, якія калечаць. Людзям даводзіцца вучыцца нанава дыхаць, гаварыць, глытаць. Гэта стрэсавыя сітуацыі, і тут без аддзялення медыка-псіхалагічнай падтрымкі не абысціся. У рэабілітацыйныя цэнтры такіх пацыентаў на стадыі 3-й клінічнай групы не бяруць. Ім не паказаны фізіятэрапія, гімнастыка. Звычайна пытаюць: «Што яны будуць там рабіць? Есці, адпачываць, дыхаць свежым паветрам?» Так! Чамусьці мы не ўлічваем, што **ім неабходна псіхалагічная дапамога.** Але пры накіраванні ў рэабілітацыйныя цэнтры гэта, на жаль, не з'яўляецца паказаннем для рэабілітацыі. Лічыцца, што яна праводзіцца ва ўстановах, дзе пацыент назіраецца, і дома. Калі чалавек жыве ў вёсцы, якая псіхалагічная дапамога яму будзе аказвацца? — акрэсліла праблему Валянціна Суравікіна.

Хворым з пухлінамі галавы і шыі на базе РНПЦ праводзяцца аперацыі па пластыцы мяккіх тканак, сківічна-тваравая рэканструкцыя, пратэзаванне. Усё робіцца бясплатна. Гэтак жа, як і эстэтычная рэабілітацыя пры выдаленні малочнай залозы, — жанчына аплачвае толькі кошт імплантаў. Паралельна пры жаданні пацыенткі праводзіцца карэкцыя другой малочнай залозы.

Пацыенты з анкалагічным дыягназам праходзяць рэабілітацыю пераважна ў РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі ў Гарадзішчы. Часам іх накіроўваюць у рэабілітацыйны цэнтр, які размяшчаецца ў Аталіне (Мінскі раён).

— Часта рэабілітацыйныя працэдуры прызначаюцца амбулаторна. Але не кожны можа вазіць сваю бабулю з умоўнага Крупскага раёна на амбулаторную рэабілітацыю да нас. Размясціць у стацыянары мы таксама не можам — ложкі ў нас заняты пацыентамі, якія маюць патрэбу ў аперацыі. Таму мы накіроўваем такіх пацыентаў у Аталіна. Нядаўна на тэрыторыі нашага цэнтра ўступіла ў строй гасцініца. Спадзяёмся, што можна будзе праводзіць рэабілітацыю амбулаторна для тых, хто пражывае ў ёй. Для беларусаў пражыванне каштуе каля 20 рублёў у суткі, — падзялілася думкамі анколаг.

**«Галоўнае, што павінны памятаць і хворыя, і іх блізкія, — для сучаснай медыцыны многія анкалагічныя дыягназы — не прыгавор».**

Паводле яе слоў, 60 % пацыентаў, якім праводзіцца прамянёвая тэрапія, праходзяць паралельна і раннюю рэабілітацыю на базе РНПЦ анкалогіі. Прамянёвая тэрапія доўжыцца месяц і лічыцца прафілактычнай працэдурай. У гэты час пацыент ужо амаль здаровы і знаходзіцца ў 3-й клінічнай стадыі. Медыкі ўбачылі ў такім падыходзе вялікую карысць: адсутнасць ранніх ускладненняў.

— Калі рэабілітацыю не праводзіць, развіваюцца, напрыклад, лімфедэмы (ацёк канечнасці). Яны бываюць розныя: 1, 5, 20, 40 сантыметраў. Толькі ўявіце розніцу паміж рукамі ў 40 сантыметраў! І такіх пацыентаў у нас, на жаль, шмат. Ім можа дапамагчы толькі хірургічнае ўмяшанне. Мы ўвесь час спадзяёмся, што пацыентаў стане менш, але, на жаль, бачым адваротную сітуацыю. Таму хацелася б, каб у нас было больш рэабілітацыйных цэнтраў, бо нашым пацыентам патрэбны дапамога і падтрымка. Ведаю, што ёсць планы па іх будаўніцтве.

Дарэчы, у структуры інваліднасці дарослага насельніцтва новаўтварэнні займаюць другое месца. Паказчык, паводле інфармацыі **вучонага-сакратара РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Аляксея РАЗУВАНАВА,** 17,8 на 10 тысяч насельніцтва. Сярод людзей працаздольнага ўзросту — 11,3 на 10 тысяч насельніцтва.

### Каб трапіць у цэнтр...

РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі прымае пацыентаў з усёй краіны. Большасць з іх паступае на ранні этап з хірургічных стацыянараў — мінскага гарадскога анкадыспансера і РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Тут ёсць два рэабілітацыйныя аддзяленні на 110 ложкаў.

— Паказанні для правядзення ранняй медыцынскай рэабілітацыі адразу пасля заканчэння радыкальнага лячэння дастаткова шырокія, — тлумачыць **загадчык анкалагічнага аддзялення № 2 РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Ганна ВАРАБ'ЁВА.** — Да нас прыязджаюць пацыенты з такімі паталогіямі, як рак малочнай залозы, мочапалавой сістэмы (жанчыны і мужчыны), бронхаў, лёгкіх, органаў стрававання (страўніка, стрававода, кішэчніка, шчытападобнай залозы). Акрамя рэабілітолагаў, дапамогу аказваюць псіхолагі і псіхатэрапеўты, фізіятэрапеўт, інструктары па ЛФК, неўролагі, отарыналарынголагі, фанапед, які дапамагае ў аднаўленні голасу.

Акрамя ранняй стацыянарнай рэабілітацыі, тут праводзіцца і позняя — для тых, у каго падчас радыкальнага лячэння развіліся ўскладненні і на працягу года пацыент не аднавіўся. На працягу першых трох-пяці гадоў з моманту ўзнікнення ўскладнення такія хворыя маюць права на рэабілітацыю ва ўмовах стацыянара. Тут працуюць і школы пацыента, дзе вучаць правільным паводзінам на працягу далейшага жыцця і даюць рэкамендацыі.

### А гарантыі?..

Як важна змяніць свой лад жыцця і што ў гэтым самае складанае, расказала **дырэктар Цэнтра падтрымкі анкапацыентаў «У імя жыцця», анкапацыентка, якая перажыла тры анкалагічныя захворванні, Ірына ЖЫХАР.**

— Мая пацыенцкая біяграфія пачыналася якраз з аддзялення пухлін галавы і шыі дваццаць шэсць гадоў таму. Вялікі прагрэс у тым, што сёння ёсць сківічна-тваравая рэканструкцыя. Пухліна, якая была ў мяне, пагражала стратай твару. Лячэнне пасля другой хваробы — раку малочнай залозы — доўжылася не 8-9 месяцаў, а год і тры месяцы плюс пяць гадоў гармонатэрапіі. Таму чалавека, больш зацікаўленага ў аднаўленні, напэўна, не знайсці. І тут вельмі складана прыняць, што новы лад жыцця — гэта назаўсёды. Ты павінен кожны дзень рабіць зарадку, піць пэўныя лекі, здаваць аналізы, праходзіць абследаванні. І задача нашай арганізацыі — расказваць пра гэта пацыентам, дапамагчы прыйсці да новых навыкаў, засвоіць іх і зрабіць часткай жыцця. У нас вельмі моцныя харчовыя і іншыя звычкі, якія з'явіліся з дзяцінства. Напрыклад, смажанае сала з бульбай — гэта не значыць, што ад яго варта адмовіцца назаўсёды, але ўжываць можна толькі як выключэнне з правілаў. Важна, каб цябе падтрымлівала сям'я, калі ты сам мяняешся. Калі вы робіце гэта разам, тады вяртання да мінулага не будзе. Многія пацыенты пытаюць: «А калі я ўсё буду рабіць, як рэкамендуеце, гэта гарантыя, што буду жыць?» Стапрацэнтнай гарантыі тут, на жаль, няма.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 18 декабря 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **<u>Условия продажи:</u> 1)** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3)** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 1, 2, 3)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Возмещение затрат по выделению земельного участка под объект недвижимости возлагаются на Покупателя (победителя аукционных торгов). **Примечание:** в соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | |
| | **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001000070** общей площадью **3,2777 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственной базы | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5035**, общей площадью **1 402,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 324/С-8673**, общей площадью **29,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сторожка. Капитальное строение с инв. № 324/С-5037**, общей площадью **322,6** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание бытового помещения с двумя пристройками. Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42. <u>Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 20.02.2019 г. № 34 (28901)</u> | **191 721,60** | 9586,08 | 19 172,16 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5039**, общей площадью **803,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание мастерской с пристройками. Капитальное строение с инв. № 324/С-5045**, общей площадью **614,6** кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 1 с пристройками. Капитальное строение с инв. № 324/С-5041,** общей площадью **357,2** кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – **одноэтажное кирпичное здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей. Капитальное строение с инв. № 324/С-9410,** общей площадью **44,7** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **здание гаража. Капитальное строение с инв. № 324/С-5040,** общей площадью **557,0** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение с инв. № 324/С-9430,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **эстакада для автомашин.** Благоустройство базы (покрытие из ж/бетон., покрытие бетонное) (инв. № 227). **Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д.42. | **133 230,00** | 6661,50 | 13 312,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5038**, общей площадью **392,4** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 2 с навесом. Капитальное строение с инв. № 324/С-5044**, общей площадью **40,7** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции. Капитальное строение с инв. № 324/С-5042**, общей площадью **423,1** кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – **здание лесопильного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8791**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **навес к лесопильному цеху. Капитальное строение с инв. № 324/С-5043**, общей площадью **415,7** кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8671**, общей площадью **65,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **компрессорная. Капитальное строение с инв. № 324/С-8790**, общей площадью **33,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сушилка с навесом. Капитальное строение с инв. № 324/С-8670**, общей площадью **230,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **склад заполнителей РБУ. Капитальное строение с инв. №324/С-5036**, общей площадью **335,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **двухэтажное кирпичное здание растворобетонного узла с пристройкой.** Трансформатор ТМ 250 (инв. № 1049). Лесопильная рама вертикальная Р63-4Б-01 (инв. № 2138). Станок СР-4-20 рейсмусовый (инв. № 229). Универсальный круглопильный станок Ц6-2 (инв. № 401). Забор стройдвора бетонный сплошной (инв. № 53/2). **Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **79 536,00** | 3976,80 | 7953,60 |
| 11 | Домик КДМ (инв. № 945) | **930,00** | 46,50 | 93,00 |
| 23 | **Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400**, заводской (серийный, идентификационный) №Y39W14000710067, 2010 года выпуска, **рег. знак ЕВ-3 3173** | **20 580,00** | 1029,00 | 2058,00 |
| 28 | **Полуприцеп специальный цистерна NPC-22 DK**, кузов (рама) № Y69AC22228PA48067, 2008 года выпуска, **рег. знак А 7143 А-3. Грузовой седельный тягач МАЗ 6430А8**, кузов (рама) № Y3M6430A890000869, 2009 года выпуска, **рег. знак АК 8638-3** | **16 260,00** | 813,00 | 1626,00 |
| 36 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A390000811, 2009 года выпуска, **рег. знак АВ 9085-3. Прицеп бортовой МАЗ 837810 042**, кузов (рама) № Y3M83781080012096, 2008 года выпуска, **рег. знак А8085 А-3** | **8310,00** | 415,50 | 831,00 |
| 38 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A380000561, 2008 года выпуска, **рег. знак АВ 6517-3. Прицеп бортовой МАЗ 837810**, кузов (рама) № Y3M83781080011730, 2008 года выпуска, **рег. знак А2349 А-3. Автобус-вагон ПАЗ 32053**, кузов (рама) № X1M3205E070008334, 2007 года выпуска, **рег. знак АК 8651-3** | **9480,00** | 474,00 | 948,00 |
| 40 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ-533603-220**, кузов (рама) № Y3M53360370005915, 2007 года выпуска, **рег. знак АК 8652-3. Прицеп бортовой MAZ 837810**, кузов (рама) № Y3M83781070010846, 2007 года выпуска, **рег. знак А 1389 В-3** | **6090,00** | 304,50 | 609,00 |
| 43 | **Грузовой седельный тягач МАЗ 6422 А5**, кузов (рама) №Y3M6422A580000572, 2008 года выпуска, **рег. знак АК 8653-3. Полуприцеп бортовой МАЗ 975800**, кузов (рама) № Y3M97580080011167, 2008 года выпуска, **рег. знак А 1387 В-3.** Кассета для перевозки камня силикатного инв. № 2055. Кассета для перевозки камня силикатного, инв. № 2056 | **11 700,00** | 585,00 | 1170,00 |
| 44 | **Прицеп МАЗ-857100 010**, кузов (рама) № Y3M857100800004765, 2008 года выпуска, **рег. знак А 1386 В-3. Грузовой самосвал МАЗ-5551А2**, кузов (рама) № Y3M5551A290001753, 2008 года выпуска, **рег. знак АК 8637-3** | **7110,00** | 355,50 | 711,00 |
| 45 | **Грузовой самосвал МАЗ 555102 220,** кузов (рама) № Y3M55510260009609, 2006 года выпуска**, рег. знак АА 6140-3** | **3120,00** | 156,00 | 312,00 |
| 49 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010,** кузов (рама) № Y3M97580080011105, 2008 года выпуска**, рег. знак 2014 АА-3** | **2940,00** | 147,00 | 294,00 |
| 51 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010,** кузов (рама) № Y3M97580090011603, 2009 года выпуска**, рег. знак А 3368 А-3** | **3060,00** | 153,00 | 306,00 |
| 53 | Инвентарное здание, инв. № 974 | **360,00** | 18,00 | 36,00 |
| 55 | Квасовозка, инв. № 1023 | **153,00** | 7,65 | 15,30 |
| 56 | Квасовозка, инв. № 1023а | **153,00** | 7,65 | 15,30 |
| 57 | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-50А1Л), инв. № 2103 | **540,00** | 27,00 | 54,00 |
| 58 | Подкатные КБ-405, инв. № 24700623 | **660,00** | 33,00 | 66,00 |
| 60 | Дом-вагон, инв. № 55 | **450,00** | 22,50 | 45,00 |
| 61 | Вагон-общежитие, инв. № 58-1 | **900,00** | 45,00 | 90,00 |
| 62 | Вагон-общежитие, инв. № 59-1 | **900,00** | 45,00 | 90,00 |
| 65 | Станция штукатурная ШС-4/6 (СО-49С), инв. № 916а. Камера для сушки одежды, инв. № 138 | **1320,00** | 66,00 | 132,00 |

<u>**Продавец:**</u> ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. <u>**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**</u> **1)** Оплатить задаток на расчетный счет <u>**Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**</u>»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно <u>**с 5 декабря 2019 г.**</u> по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе <u>**заканчивается 17 декабря 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**</u> Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за <u>**5 (пять) дней**</u> до его проведения.

